Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
Францішак БАГУШЭВІЧ



Наша слова

Штотыднёвая газета
(Выходзіць з сакавіка 1990 г.)

№ 27 (239)

5 ліпеня 1995 г.

Кошт — 500 рублёў

РЭДЗЬЯРД КІПЛІНГ І ФЕНОМЕН БРЫТАНСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ХАРАКТАРУ Стар. 5.

РОДНАЯ МОВА БЫЛА ЗБРОЯЙ РЭФАРМАТАРАЎ Стар. 4.

ПОСТУП ТЫДНЯ



○ **У БРАЦІСЛАВЕ ПРАЙШОЎ МІЖНАРОДНЫ СЕМІНАР МІНІСТРАЎ КУЛЬТУРЫ ЕЎРАПЕЙСКІХ КРАІН,** які быў прысвечаны праблемам і перспектывам развіцця культур. У семінары ўдзельнічалі прадстаўнікі з 21 краіны. З дакладам выступіў і міністр культуры і друку Рэспублікі Беларусь Анатоль Бутэвіч.

○ ***У МЕНСКУ АДКРЫТА ГЕНЕРАЛЬНАЕ КОНСУЛЬСТВА РЭСПУБЛІКІ ЭСТОНІЯ.***

○ **У АПОШНЮЮ НЯДЗЕЛЮ ЧЭРВЕНЯ** пад эгідай Камітэта па справах моладзі прайшло чарговае святкаванне Дня моладзі.

○ ***ЯК ВЯДОМА, У НОВЫ ВЯРХОЎНЫ САВЕТ УЖО ВЫБРАНА 119 ЧАЛАВЕК.*** *Сярод іх значная колькасць аграрнікаў. У адным з апошніх нумароў газеты «Звязда» змешчана гутарка з трыма прадстаўнікамі Аграрнай партыі. На пытанне карэспандэнта «Ці можа так здарыцца, што падчас работы новага Вярхоўнага Савета Беларусь стане часткай іншай дзяржавы?» дырэктар саўгаса «Зара» Ваўкавыскага раёна Віктар Пыжык адказаў: «Рэспубліка Беларусь сёння з'яўляецца суверэннай дзяржавай і замахвацца на суверэнітэт нікому не дадзена, у тым ліку і новаму парламенту. Магу адназначна сказаць, што ён ні ўякім разе гэтага не зробіць». На жаль, не ўсе так думаюць, але ёсць надзея, што новы парламент не стане магільшчыкам сваёй краіны і самога сябе.*

○ **У МЕНСКУ СТВОРАНЫ РЭСПУБЛІКАНСКІ ФОНД ПАДТРЫМКІ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ.** Старшынёй фонду абраны генеральны дырэктар беларускай будаўнічай фірмы Аляксандр Бараноўскі, а сустаршынёй — пісьменніца Раіса Бондар.

Камісія рэкамендуе ведаць дзве мовы і здаваць два экзамены

У сувязі з тым, што майскі рэферэндум у Беларусі прыраўняў статус рускай мовы да статуса беларускай, Камісія Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны прыняла пастанову, у якой рэкамендуе міністэрствам і ведамствам Рэспублікі Беларусь ажыццявіць комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на тое, каб супрацоўнікі дзяржаўных устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў належным чынам валодалі і беларускай, і рускай мовамі. Пры гэтым, на думку Камісіі, трэба звярнуць першачарговую ўвагу на вывучэнне той мовы, якой яны не валодаюць або валодаюць у аб'ёме, не дастатковым для выканання службовых абавязкаў.

Другой сваёй пастановай Камісія рэкамендавала Міністэрству адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь увесці для абітурыентаў усіх вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў два абавязковыя экзамены: адзін — па беларускай, другі — па рускай мове.

Што? Дзе? Калі?

Гэта ўжо стала традыцыяй, а таму паўтарылася і сёлета: 28 чэрвеня, у дзень угодкаў смерці Янкі Купалы, у менскім касцёле св.Роха была адслужана імша за душу паэта.

У гэты ж дзень на сталічных Вайсковых могілках ля магілы паэта пад нацыянальнымі сцягамі сабраліся ўсе, каму дарагая памяць нашага славутага земляка.

У.П.

Здаровы сэнс падказвае: тым, хто хоча нармальна жыць, трэба паразумецца

А што значыць паразумецца? Наша газета так скіраваная, што вельмі ўважліва ставіцца да ўсіх сэнсавых значэнняў слова. Бо ці не бывае часам так, што нехта прамаўляе адно, а мае на ўвазе зусім іншае. Як было з тым жа словам «камунізм». Змагаліся за тое, каб адабраць у багатых і падзяліць паміж беднымі, а ўрэшце атрымалася, што тыя, хто займаўся дзяльбою чужой маёмасці, з дапамогаю ўзброенай сілы, дзяржаўнага апарату прымусу зрабілі гэта сваёй прафесіяй і да таго ўвайшлі ў смак, што працягвалі дзяліць і тое, што выраблялі бедныя — рабочы клас, сялянства, — на сваю карысць, пакінуўшы пралетарыяту «светлую мару» пра камунізм. Таму мы насцярожана ставімся да тых, хто цяпер кліча народ у «светлае ўчора», някепска ўладкоўваючыся ўжо сёння ля апарату звыклай дзяльбы. Мы ўважліва ўчытваемся і ў назвы палітычных партый — а што за імі? Некаторыя з іх — большасць — назваліся замежнымі словамі, у тым ліку і такім, здавалася б, пашыраным, якое паходзіць ад старажытнагрэцкага «дэмас» — «народ», у той час як сам гэты народ у нас пакуль, здаецца, да канца не дужа і ўцяміў — а што гэта за такое.

Але ж і тое праўда, што, нават назваўшыся тутэйшымі словамі, партыя можа заставацца «катом у мяху». Пакуль не пачынае дзейнічаць. Так сталася і з Партыяй здаровага сэнсу. З аднаго боку — усе партыі кажуць, што яны за «здаровы сэнс», але ж не кожная заклікае зрабіць усё, каб у Беларусі была дзяржаўная незалежнасць, нейтралітэт, рынкавая эканоміка разам з сацыяльнай абаронай насельніцтва. У гэтым сапраўды ёсць сэнс, як і ў тым, каб зараз паяднацца дэмакратычным партыям, грамадскім арганізацыям ды ўсім чэсным людзям і восенню абраць у Вярхоўную Раду адукаваных, чэсных, падрыхтаваных для стварэння добрых законаў дэпутатаў. Такі зварот распаўсюдзіў Выканкам рады Партыі здаровага сэнсу і яе старшыня прадпрымальнік І.І.Каравайчык.

У.А.

Але!

Купалля з «Беларускай маладзёжнай» не адбылося: забаранілі!

Што ні кажы, а для нашага брата-журналіста надышлі змрачнаватыя часіны. А калі ты яшчэ пры гэтым не проста журналіст, а з павагай ставішся да беларушчыны, тут столькі пры выпадку ахвотнікаў знойдзецца, каб табе ў душу плюнуць, што Божа ты мой!

...Рэдакцыя незалежнай газеты «Беларуская маладзёжная» нядаўна рашыла свой дзень нараджэння (а дата была сур'ёзная — год існавання) адзначыць у гарадскім парку імя М.Горкага сталіцы. Нават выдатны назоў святу дала: «Купалле разам з «Беларускай маладзёжнай». Запрасілі на адкрытыя пляцоўкі фальклорныя і дзіцячыя калектывы з Менска, Чэрвеня і Заслаўя, вядомыя нацыянальныя рок-гурты — «Крама», «Новае неба» і «НМР»... За ўсё заплачана, пра ўсё замоўлена. Дырэкцыя парку, праўда, папрасіла рэдакцыю атрымаць дазвол у Партызанскім райвыканкаме. 6 чэрвеня сваю рэзалюцыю напісала (на заяве «Беларускай маладзёжнай» да дырэктара парку) намесніца старшыні згаданай «вертыкалі» А.Д.Галалоб: згодная, толькі просіць правесці свята з 17.00 да 20.00, каб дзеці своечасова дамоў трапілі.

І якое ж было здзіўленне галоўнага рэдактара «БМ» Тацяны Мельнічук, калі 20 чэрвеня, за суткі да свята, ёй у парку далі ад варот паварот: так і так, шаноўная, свята не будзе — Партызанскі райвыканкам передумаў — «адклікаў свой дазвол» (так цяпер гэта называецца): ёсць папера за подпісам спецыяліста па культуры раённай «вертыкалі» Л.Б.Сеннікавай, а тая паведамляе — дазвол на свята не дае гарвыканкамаўскае ўпраўленне культуры.

Чаму?

На гэта і іншыя пытанні беларускіх ды замежных журналістаў адказвалі прадстаўнікі ўпраўлення культуры і УУС Мінгарвыканкама. Падпалкоўнікі і маёры праз мегафоны даводзілі, што свята «адмянілі і ўсім трэба разыходзіцца». А нейкі мужчына і сімпатычная паўнаватая жанчына «ад культуры» тлумачылі, што паколькі «БМ» запрасіла сюды яшчэ і аўтараў, сярод якіх, аказваецца, ёсць і вядомыя палітыкі, то ёсць падазрэнне, што замест свята тут будзе мітынг.

Мы, журналісты, каторыя там былі, далі гэтаму казусу іншую характарыстыку: наступ на дэмакратыю, беларушчыну і незалежныя ад «вертыкалі» сродкі масавай інфармацыі. Ці ведаюць шаноўныя начальнікі, што на дні нараджэння ходзяць нават палітыкі? Нарэшце, чаму і хто рашыў, што, напрыклад, той жа Станіслаў Шушкевіч, віншуючы газету з гадавінай існавання ў нялёгкіх эканамічных і палітычных умовах, будзе заклікаць да гвалту, сеяць нейкую нацыянальную ці сацыяльную варажнечу? Абсурд? Але ўзведзены ў ранг палітыкі, ён і сапраўды ўносіць жорсткасць у душы, знішчаючы беларускую культуру, якая тут мелася сябе паказаць яскрава, шматжанрава і шматпланава.

Тым не менш далей падзеі разгортваліся стыхійна: паколькі пакідаць парк нікому не хацелася, на пляцоўцы ля ўвахода пачалося выступленне рок-гуртоў і асобных бардаў. Былі і некаторыя палітыкі, якія сваімі расповядамі крыху пасмяшылі шаноўную публіку.

Ну, а мае калегі замест святочных сюжэтаў атрымалі унікальныя фотаздымкі і кіна- ды відэакадры — для летапісу аб норавах уладных структур узору 1995 года. Калі яны чуюць слова «беларуская культура», то хапаюцца за мегафон, каб яе забараніць. Так атрымалася і са святам газеты «Беларуская маладзёжная», журналістаў якой кебічаўцы год таму разагналі разам з радыёстанцыяй «Беларуская маладзёжная».

Алесь МІКАЛАЙЧАНКА,
сябра Аргкамітэта Беларускай асацыяцыі журналістаў.

«ЦАРКВА» — новая газета беларускіх грэка-каталікоў

У выдавецтве «Унія» (выдавецкая суполка «Унія» ТБМ імя Ф.Скарыны) выйшаў першы нумар газеты «Царква», заснавальнікамі якой сталі дзве грэка-каталіцкія парафіі з Менска. Рэдакцыя знаходзіцца ў Полацку, яе ўзначаліў іераманах Валеры Алексійчук, які таксама кіруе полацкім грэка-каталіцкім манастыром св.Барыса і Глеба.

Першы нумар прысвечаны вялікаму посту і змяшчае падборку артыкулаў на гэтую тэму. У Слове на Крыжапаклонную нядзелю апостальскі візітатар а.Сяргей Гаек запрашае вернікаў да аднаўлення занядбаных і будовы новых святыняў на нашай зямлі. Багатая і змястоўная рубрыка навінаў расказвае пра жыццё Каталіцкай Царквы на Беларусі і ў свеце. Найлепшым матэрыялам нумара сталі, на мой погляд, урыўкі з папулярных навучанняў вядомага святара з Югаславіі Грыгорыя Планчака, якія заахвочваюць яшчэ раз падумаць пра нашае ўласнае жыццё. Хто я? Што мне рабіць? Дзе маё месца ў гэтым свеце? На гэтыя пытанні спрабуе дапамагчы адказаць а.Планчак. У рубрыцы «Мінулае» публікуецца гістарычны нарыс пра Унію на Падляшшы.

На старонках для дзяцей змешчаны пачатак Біблійнага катэхізісу, які стане добрай чытанкай для дзяцей і дапаможнікам для нядзельных школ. Маладзёжныя старонкі, названыя «Пілігрым», прысвечаныя дзейнасці на Беларусі каталіцкіх супольнасцяў моладзі. Нумар завяршае падборка інфармацыі пра новыя кнігі і публікацыі на рэлігійныя тэмы.

У бліжэйшых нумарах «Царквы» рэдакцыя мяркуе пачаць публікаваць невядомыя на Беларусі казанні Антона Неманцэвіча і працы а.Льва Гарошкі. Гісторык Сяргей Абламейка рыхтуе серыю нарысаў пра «Новую Унію» — адраджэнне грэка-каталіцтва ў Заходняй Беларусі ў 20—30 гг. нашага стагоддзя. Ён абяцае новыя, невядомыя раней факты і арыгінальную канцэпцыю ацэнкі «Новай Уніі».

Падпіску на газету «Царква» з трэцяга квартала г.г. прымаюць усе паштовыя аддзяленні на Беларусі і Украіне. Індэкс газеты ў каталогу 63205. Папярэднія нумары можна набыць у любой грэка-каталіцкай парафіі, у Менску — таксама ў кіёску ТБМ на праспекце Скарыны альбо замовіць у выдавецтве «Унія» (220050, Менск, п/с 224).

Ігар ІВАНОЎ.

Актуальна

Аляксандр Падлужны: горыч і аптымізм

(Гутарка з дырэктарам Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук А.Падлужным)

— Аляксандр Іосіфавіч, нешта мы перасталі пра Вас чуць. Як маецца Ваш інстытут?

— Вельмі трапна зададзена пытанне, на якое хочацца адказаць амаль жартоўна: ледзь маемся, але трымаемся. Да гэтага дня ўсе супрацоўнікі атрымлівалі зарплату. Далей будзе горш, бо ўжо многія суседнія акадэмічныя інстытуты «ўмацоўваюць» сваё здароўе без захавання заработнай платы. Прыпыніліся ўцёкі навуковых кадраў, але заманіць каго-небудзь з сёлетніх выпускнікоў не ўдаецца: не прываблівае заработная плата і перспектывы. Страшэнныя цяжкасці з публікацыяй вынікаў даследаванняў. Амаль спыніўся навуковы рост супрацоўнікаў, кожны заняты тым, каб дзе-небудзь хоць штонебудзь падзарабіць.

— Як Вы ўспрымаеце тое, што адбылося. Якія ўражанні ад рэферэндуму?

— У нас з даўняга часу вяліся сацыялінгвістычныя даследаванні, таму мы ведалі, што пераважная большасць насельніцтва нашай краіны вельмі станоўча адносіцца да рускай мовы. Не трэба было праводзіць рэферэндуму, каб у гэтым упэўніцца. Для спецыялістаў больш важна іншае пытанне: як паднясць прэстыж, умацаваць пазіцыі беларускай мовы — мовы карэннага насельніцтва, важнейшага элемента і інструмента культуры. Рэферэндум на гэта пытанне не мог даць адказу. А ўзрадаванае чыноўніцтва адразу ж пасля рэферэндуму пачало рэалізацыю сваёй задумы: з новага навучальнага года мову навучання ў школах будуць вызначаць бацькі! І будзем мы зноў самымі арыгінальнымі ў свеце, бо як бацькам нідзе ў свеце такога няма, і дзяржаўнае кіраўніцтва здымае з сябе ўсю адказнасць. Праўда, няясна, як воля бацькоў будзе выяўляцца — простай большасцю галасоў ці канстытуцыйнай, на сходзе ці па пісьмовых заявах?

У ВНУ экзамен можна здаваць па выбару: якую мову лепш ведаеш, тую і здавай. Гэта моцны падмурак для таго, каб у далейшым даць магчымасць і выбару мовы як вучэбнага прадмета.

Уяўляю сабе М.В.Ламаносава, які ўжо дарослым латынь зубрыў, а над ім насміхаліся, каб ён заявіў пратэст. Ці наш Ф.Скарына разам са сваімі землякамі падняў бунт у Кракаве адносна мовы навучання. Ці былі б яны тым, чым сталі для сваіх краін? А ў нас, як пісала адна вядомая расійская газета рукою нашага земляка, шасцігодкі-першакласнікі бунты наладжвалі.

У інстытуце мы вельмі добра адчулі вынікі рэферэндуму. Ужо гадоў пятнаццаць выходзіць штогоднік «Беларуская лінгвістыка». Зусім нядаўна выйшаў з друку выпуск 43. Тыражом аж 260 экземпляраў. Такога яшчэ не было, бо выданне карысталася попытам як у нас, так і за мяжой. За мяжой не менш, чым у нас. А зараз нават гэты мізэрны тыраж ні адна гандлёвая арганізацыя не бярэ, і ляжыць ён на складзе ў выдавецтве «Навука і тэхніка». А вось на кнігу, прысвечаную дыялектнай лексіцы, паступіла заказаў на 84 экземпляры, з іх «Белкніга» заказала аж два экземпляры.

— Якія Вашы ўражанні ад настрою ў грамадстве?

— На маю думку, адносна моўнага пытання настрой у розных пластоў грамадства і розных палітычных плыняў розны. Для большасці нашых грамадзян моўнае пытанне знаходзіцца па-за межамі светлага пункта свядомасці, хоць нельга думаць, што кожны, хто прагаласаваў за першае пытанне рэферэндуму, супраць беларускай мовы. І здаецца, што ў бліжэйшы час будуць яўныя пацвярджэнні гэтаму. Як толькі гэта выявіцца, дзяржаўныя дзеячы ўсвядомяць неабходнасць распрацоўкі грунтоўнай моўнай палітыкі і яе ажыццяўлення пад строгім дзяржаўным кантролем. Святочны настрой у тых, хто ўсяляк імкнуўся спраўакаваць правядзенне рэферэндуму. Пад моцным шокам павінны знаходзіцца тыя, хто ўсяляк паспешваў выкананне Закона аб мовах у поўным аб'ёме, а галоўнае, хто апошнія гады займаўся ганьбаваннем той літаратурнай мовы, якая склалася ў савецкі перыяд, хто патрабаваў і рэальна праводзіў «рэфармаванне» зусім па-партызанску, а фактычна разбураў мову і тым самым таксама правакаваў рэферэндум. Між іншым, іменна ў асяродку гэтых апантаных, па-свойму адданых беларускай мове людзей яшчэ ў другой палове 80-х гадоў і пачала выносіцца ідэя правядзення рэферэндуму па моўных пытаннях.

Ёсць значная колькасць людзей, у тым ліку сярод моваведаў, якія лічылі і лічаць, што галоўная задача і да рэферэндуму, і пасля яго заключаецца не столькі ва ўнутраным удасканаленні беларускай мовы, колькі ва ўмацаванні яе пазіцый у грамадстве, павышэнні яе прэстыжнасці, што патрабуе часу, цярпення і дасканалых ведаў.

— Што б Вы пажадалі свайму інстытуту?

— Каб беларуская мова, па меншай меры, мела такі ж статус у грамадстве, як і руская. У гэтым сэнсе мае пажаданні амаль супадаюць з тым, што выражана ў рэферэндным пытанні Прэзідэнта.

Каб праца беларускіх моваведаў знаходзіла маральную падтрымку з боку грамадскасці і трошкі матэрыяльную з боку дзяржавы.

Распытвала Любоў БАРШЧЭЎСКАЯ.

У газетах

Ці застануцца ў гэтым свеце беларусы?

Як ніколі раней, бурліць наша грамадства. Яго пэўная частка сапраўды, здаецца, атрымала асалоду ад таго, як у час рэферэндуму беларусы ўласнымі рукамі паставілі крыж на асновах сваёй нацыянальнасці, самастойнасці Беларусі. На вуліцах і ў магазінах, нават у сем'ях успыхваюць дыскусіі. Зусім нядаўна я таксама быў удзельнікам такой баталіі, калі ехаў у электрычцы з Мінска да сябе на радзіму. Добра знаёмы, паважаемы мною чалавек звярнуўся да мяне з пытаннем аб мэтазгоднасці галасаваць за прапановы «ўсенародна» абранага Прэзідэнта. Высветлілася, што для майго суразмоўцы мова — з'ява другарадная, галоўнае — эканоміка, матэрыяльная забяспечанасць, якой спрыяць быццам бы будзе Расія. А вось бел-чырвона-белы сцяг, «Пагоня» — сімвалы здрадніцкія, фашысцкія, а пры савецкай уладзе, маўляў, было ўсім хораша. Я слухаў уважліва, цярпліва, без пярэчанняў. Але мяне ў тых выказваннях здзівіла вельмі многае. А больш за ўсё тое, што мой знаёмы — беларус, што яго бацьку знішчылі як ворага савецкай улады і нацдэма, як прадстаўніка найбольш працавітай і ўдумлівай часткі беларускага сялянства. Міжволі падумалася: як такое магло здарыцца, што забыў чалавек трагедыю роду свайго. Мозг шукаў адказу. І тут успомнілася, што мой знаёмы уступіў у КПСС, удзельнічаў у вайне супраць фашызму, стаў афіцэрам, потым у савецкай іерархіі займаў сярэднія кіруючыя пасады, у час вучобы прайшоў курс хлуслівай гісторыі, не меў аніякага ўяўлення аб сапраўдным мінулым беларускага народа, яго сімвалах, аб лёсе яго мовы і яе ролі ў станаўленні нацыянальнага характару беларусаў. Таму дагматызм савецкага часу ўвайшоў у свядомасць майго спадарожніка ўжо на генным узроўні і не даваў яму магчымасці самастойна думаць і пранікаць у сутнасць сучасных, больш чым заблытаных грамадскіх працэсаў, да якіх як раз і прывяла савецкая ўлада шляхам знішчэння каля мільёна не проста прадстаўнікоў беларускага народа, а лепшай часткі беларускай нацыі, стварэння хваравіта залежнай эканомікі, у асноўным, — толькі для патрэб СССР, прыніжэння чалавечай асобы.


Вярнуўся ў Мінск. Адчуў адразу ж павелічэнне агрэсіўнасці інтэлектуальнага наступу адпаведнай, значнай часткі нашых грамадзян на беларускасць наогул. Заходжу, напрыклад, у прыёмную рэктара аднаго з інстытутаў. А там «і.о.» загадчыка адной з кафедраў зняважальна выказвае літаральна наступнае: «Как хорошо, что белорусский язык отменяется, отлетит сейчас всякая белорусская шелуха». Мне і раней прыходзілася чуць ад яе прыкладна такія брыдоты: «Пусть помолчат эти белорусы, мы приехали, их хоть чему-то научили». Аднак мне добра вядома, што ніхто гэтую даму сюды не запрашаў. Яна прыехала з бацькам, які быў прысланы для мацавання савецкай улады і працаваў міністрам ці намеснікам міністра. Быццам бы нельга было знайсці на гэтую пасаду карэннага жыхара. У гарадах Беларусі рускіх у сярэднім 20—25 працэнтаў. Значная іх частка была прыслана зноў жа для мацавання саветаў або ваеннай моцы СССР.

Не пазбеглі наступу на беларускасць і ўрачыстасці ў гонар 50-годдзя Перамогі. Тут беларускім духам зусім і не пахла. Наадварот, многае зводзілася да таго, каб мы адчувалі нават няёмкасць за любоў да сваёй роднай Беларусі. Бо ўсюды гучала адно — «великий советский народ». А між тым, калі б не было Беларусі, як буфера, то фашысцкія полчышчы яшчэ да 1-га кастрычніка 1941 года дакаціліся б да Урала. І перамога была б зусім іншай.

Я пішу ўсё гэта зусім не для таго, каб распаліць варожасць. Пішу таму, што наступ антыбеларускіх сіл, іх агрэсіўнасць павялічваюцца. Ціск на простага, даверлівага беларуса нарастае, каб ён не разабраўшыся выступіў супраць самога сябе.

Адзначу, што вынесеныя на рэферэндум пытанні патрабавалі не толькі ўзважанага падбору фармуліровак, але і дастатковага часу для разгляду ў самых процілеглых варыянтах сродкамі масавай інфармацыі, што так і не адбылося. Таму прэзідэнцкі рэферэндум, па сутнасці, толькі адцягнуў увагу народа ад самых неадкладных жыццёвых праблем і, як і варта было чакаць, прывёў да сур'ёзнага абвастрэння напружанасці ў грамадстве.

Аляксей САЛАМОНАЎ,
доктар тэхнічных навук, прафесар.
(З газеты «Свабодныя прафсаюзы», № 23, 95 г.)


ПЛАН-КАТАЛОГ
PLAN-CATALOGUE

Шматтомнае выданне беларускай літаратуры
і літаратуры пра Беларусь
ад старажытнасці да нашых дзён

"БЕЛАРУСКІ КНІГАЗБОР"

"BELARUSIAN LIBRARY"

A multi-volume publication of Belarusian literature
and literary works about Belarus
from its ancient times till these days

МІНСК
1995

«Беларускі кнігазбор»

Асобнай брашурай выйшаў з друку анатаваны план-каталог шматтомнага выдання беларускай літаратуры і літаратуры пра Беларусь ад старажытнасці да нашых дзён. У ім пазначана 180 пазіцый. Ужо з аднаго пераліку імёнаў і назваў кніг відаць, якую багатую і непаўторную маем мы літаратурную спадчыну. На жаль, нямногія з жыхароў нашай краіны гэта ведаюць. Таму сам план-каталог з'яўляецца дапаможнікам для вывучэння духоўных набыткаў беларускага народа. Брашура дае добрае ўяўленне пра асноўныя вехі тысячагадовага развіцця нашай літаратуры, а таксама пра здабыткі ў галіне гісторыі, этнаграфіі і фальклярыстыкі. Міжнародны Фонд «Беларускі кнігазбор», які распачынае гэтае унікальнае выданне, выказвае шчырую падзяку навукова-камерцыйнай фірме «Прэтті» за дапамогу ў выпуску план-каталога.

Азнаёміцца з брашурай і набыць яе можна ў шапіку ТБМ, што на праспекце Ф.Скарыны, ці ў Доме літаратара, у пакоі 209.

Актуальна

Беларускі прадпрымальнік: «Мы гатовы плаціць за свабоду нашага народа»

Кароткі жыццяпіс Мікалая Люцко: адукацыя — вышэйшая эканамічная. Служыў у войску, працаваў у Дзяржплане БССР, Дзяржкамнафтапраекце, Дзяржаграпраме, Генеральным консульстве СССР у Кітаі. З 1992 года займаецца прыватным бізнесам. З'яўляецца старшынём Беларускага згуртавання прадпрымальнікаў.

Прапануем чытачам гутарку з ім карэспандэнта «Нашага слова».

— Калі і кім была створана ваша арганізацыя?

— Згуртаванне прадпрымальнікаў Беларусі было зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі ў 1992 годзе. У гэтым годзе мы прайшлі перарэгістрацыю і цяпер называемся Беларускае згуртаванне прадпрымальнікаў. У гэтую структуру ўваходзяць людзі, зацікаўленыя ў адраджэнні прадпрымальніцтва на зямлі нашых бацькоў, якія ўсведамляюць, што толькі гаспадары гэтай зямлі і таго, што на ёй знаходзіцца, будуць дбаць аб яе будучыні.

Сусветная практыка паказала: там, дзе прадпрымальнікі з'яўляюцца моцным слоем грамадства, менавіта яны ствараюць умовы і выдаюць сродкі на нацыянальную культуру і адукацыю, на справу захавання гістарычнай спадчыны народа.

— Сёння ў краіне існуе некалькі структур, што яднаюць бізнесменаў. Чым розніцца ад іх ваша?

— Перадусім нашае згуртаванне розніцца ад іншых тым, што свае капіталы мы стварылі чэсна, уласнай працай. Гэта значыць, што яго ўдзельнікі самі вялі свае справы, не карысталіся ні грашыма КПСС, ні беспрацэнтнымі крэдытамі ўрада. Мы з уласнае капейкі стварылі рубель, з рубля — мільён.

— Як, па-Вашаму, трэба разумець акрэсленне «беларускі прадпрымальнік» — як прыналежнасць бізнесмена да пэўнага народа, дзяржавы або тэрыторыі?

— Сябры нашай арганізацыі, як і ўсе людзі, што займаюцца прадпрымальніцтвам, не дзеляцца паводле нацыянальнай прыналежнасці, хаця сам я гавару па-беларуску. Уваходзячы ў нашу арганізацыю, людзі карыстаюцца не прынцыпам паходжання, а іншым: мы яднаем людзей, грамадзян гэтай дзяржавы, тых, якія збіраюцца працаваць у ёй на карысць гэтага краю і яго народа. З гэтага, дарэчы, вынікае і фінансаванне намі пэўных нацыянальных і сацыяльных праграм.

— Які ўплыў на эканоміку краіны мае структура, якую Вы прадстаўляеце?

— Пакуль што не вельмі значны, і гэта зразумела. Рэч у тым, што практычна ўсе буйныя прадпрыемствы і аб'яднанні ўзначальвалі і ўзначальваюць дагэтуль людзі, пастаўленыя на свае пасады партыяй. Стварыць ім канкурэнцыю нялёгка. І якраз гэтыя людзі ў сённяшняй незалежнай Беларусі прадстаўляюць інтарэсы калі не партыі, дык, прынамсі, дзяржавы «ад Буга да Курыл». Прывяду такі аргумент: грузавікі, якія выпускае МАЗ, прыстасаваныя да збыту на Усход, а не на Захад, яны не адпавядаюць патрабаванням заходняга рынку. Гэта толькі адзіны прыклад аднабаковай арыентацыі нашай эканомікі, месца ў якой для такога аб'яднання, як нашае, увогуле не прадугледжана.

— З Вашых словаў вынікае, што інтарэсы беларускіх бізнесменаў і іхніх канкурэнтаў за ўсходняй мяжой бываюць узаемна супярэчнымі. Ці існуе нейкае супрацьстаянне паміж беларускім і расійскім прадпрымальніцтвам?

— Пачну свой адказ з наступнага сцвярджэння: бізнес не мае нацыянальных рысаў. Але гэткае становішча склалася ў краінах, урады якіх стварылі ўмовы для абароны нацыянальнага прадпрымальніцтва, дзе немагчыма скупка на карані большай часткі маёмасці замежнымі фірмамі. У Беларусі ж, наадварот, існуе рэальная магчымасць скупкі зямлі, прадпрыемстваў і іншага замежным капіталам, перадусім расійскім. гэтыя тавары масай вывозіліся ў іншыя рэгіёны СССР, бо мяжы тады, як і цяпер, не было. Страты, якія панесла на гэтым наша эканоміка, цяжка нават уявіць.

Моцным ударам для беларускіх бізнесменаў былі і захады Кебіча па ўключэнні Беларусі ў рублёвую зону — вынікам таго стаў спад дзелавой актыўнасці.

А сёння мяне інфармуюць аб тым, што многія банкі знаходзяцца на мяжы банкруцтва, бо замест эканамічных рэформ у краіне адбываецца тое, што можна назваць эканамічнай контррэвалюцыяй. Таму сёння нашыя прадпрымальнікі замест таго, каб укладаць зароблены грошы ў пашырэнне справы і праз гэта спрыяць павышэнню жыццёвага ўзроўню грамадзян, вывозяць капіталы з Беларусі за мяжу, Адчыніўшы мяжу на Усходзе, нашыя ўлады нават не спрабавалі прадугледзець усіх наступстваў гэтага. Час эканамічнай барацьбы паміж беларускім і замежным капіталам наперадзе, і наўрад ці яе вынікі будуць на нашую карысць.

Кожная дзяржава павінна абараняць інтарэсы сваіх прадпрымальнікаў, што, дарэчы, робіць Расія. Таму каля 70 працэнтаў прадпрыемстваў там ужо перасталі быць дзяржаўнай маёмасцю. Гэта дало магчымасць расійскім бізнесменам накапіць вельмі значныя сродкі. У нас жа доля раздзяржаўленых прадпрыемстваў складае каля 5 працэнтаў. Гэта значыць — беларускія прадпрымальнікі не маюць дастатковай колькасці грошай, каб на роўных канкураваць з расійскім бізнесам. І калі іхнія інтарэсы не будуць абаронены дзяржавай, дык нашая краіна будзе папросту скуплена. Гэта ўжо адбываецца — у Брэсце, на мяжы з Польшчай, ёсць цэлыя пад'езды і дамы, скупленыя нашымі былымі суайчыннікамі. І гэты працэс шырыцца. Няма сумневу, што пасля таго, як тут узнікне магчымасць для грамадзян Расіі свабоднага ўкладання сродкаў, дык праз нейкі час нашы грамадзяне, прачнуўшыся, могуць пачуць: вось вам кампенсацыя, ваш дом прададзены, вымятайцеся.

— Нацыянальная эканоміка настолькі залежная ад дзяржаўнай палітыкі?

— Як бачыце. Паглядзіце, напрыклад, чым для нацыянальнага бізнесу становіцца адчыненне мяжы з Расіяй. Памятаеце час СССР і адзінай для ўсіх рэспублік валюты? Калі Саюз дажываў апошнія гады, у рэспубліках Прыбалтыкі пачалі павышацца цэны і заробкі. Гэта ж услед за імі пачала рабіць і Расія. А беларусы, адданыя, як і цяпер, абароне чужых эканамічных інтарэсаў, штампавалі паперкі — талоны на размеркаванне тавараў у час, калі у свабодныя эканамічныя зоны. Дзякуючы чаму ўзбагачаюцца краіны якія заўгодна, але не Беларусь.

Сёння Беларусь, так і не стварыўшы нацыянальнай, зарыентаванай на інтарэсы краю і яго грамадзян эканомікі, зноў вяртаецца да жорсткай размеркавальнай сістэмы. Так, часам урад робіць крокі ў рэнейшым кірунку, але вялікага значэння яны не маюць. Праблема ў тым, што Беларусь не мае канцэпцыі нацыянальных эканамічных пераўтварэнняў. Два з паловай гады я працаваў у Кітаі і таму ведаю: багатай і незалежнай можа стаць толькі тая краіна, у якой жывуць багатыя людзі. Кітайцы знайшлі выйсце, аддаўшы зямлю ў арэнду з правам перадачы ў спадчыну. Чаму я гавару аб гэтым? А ўспомніце, як многія выданні, у тым ліку і вашае, наракаюць на недахоп у беларусаў патрыятызму! Але ж не можа чалавек любіць зямлю, якая яму не належыць! Ён не будзе нічога на ёй будаваць, не будзе ўкладаць у яе грошы. Вось вам прыклад сувязі паміж эканомікай і патрыятызмам.

— На Ваш погляд, радыкальна змяніць гэткае становішча заняпаду ў стане менавіта нацыянальная буржуазія?

— Я ўжыў бы іншае акрэсленне: гаспадары на сваёй зямлі. Так, у стане, але пры ўмове, што ім развяжуць рукі. І, дарэчы, стан заняпаду і нацыянальныя прадпрымальнікі могуць пераадолець не толькі ў галіне эканомікі, але і беларускай культуры. Успомніце: першыя нацыянальныя тэатры, бібліятэкі, друкарні, навучальныя ўстановы фундаваліся не проста энтузіястамі, а багатымі людзьмі, магнатамі-гаспадарамі. Успомніце аб тым, што ні заснавальнік Кракаўскага універсітэта Ягайла, ні першадрукар Скарына, ні геніяльны паэт Купала, як і сотні іншых асобаў, імёны якіх непадзельна звязаныя з усталяваннем нашай дзяржаўнасці і росквітам культуры, не паходзілі з бедных сем'яў. Успомніце аб тым, што сотні гадоў таму беларускую дзяржаву стварылі людзі, якія шанавалі родную зямлю не толькі з пачуцця «голага» патрыятызму, але і таму, што яна была іхняй уласнасцю.

— З гэткіх жа прычын выдаткуюць грошы на беларускія культурныя ды іншыя праграмы і ўдзельнікі прадстаўленай Вамі структуры?

— Багацця Радзівілаў ніхто з нас яшчэ не нажыў. Тым не менш мы і сапраўды фінансуем адраджэнскія мерапрыемствы: святкаванні, імпрэзы... Мы гэта лічым патрэбным хаця б таму, што без адраджэння нацыянальнай свядомасці немагчыма існаванне нацыянальнай дзяржавы, а значыць, і нацыянальнага бізнесу. Гэтыя рэчы, на першы погляд, далёкія, на самай справе звязаныя паміж сабой, і вельмі шчыльна.

— Ці адчувае вашая арганізацыя неабходнасць падтрымкі, акрамя нацыянальнага руху, руху палітычнага — беларускай партыі ці партый, інтарэсы якіх супадаюць з вашымі?

— У Згуртаванне прадпрымальнікаў уваходзяць людзі розных перакананняў. Кожны з іх мае ўласныя грошы і, калі жадае, можа даваць іх на патрэбы нейкай партыі альбо руху. Мы гэта не кантралюем, хаця, як мне вядома, камуністычныя арганізацыі не фінансуе ніхто з сяброў БЗП.

А калі гаварыць аб сувязях паміж бізнесменамі і палітыкамі, дык нядаўнія выбары ў Вярхоўны Савет паказалі: найбольш шанцаў мелі кандыдаты тых палітычных партый, якія мелі падтрымку фінансістаў. І, як я мяркую, нацыянальна дэмакратычныя сілы — БНФ, Грамада, АДПБ, Сялянская партыя — прайгралі менавіта таму, што калі і мелі фінансавую падтрымку прыватнага бізнесу, дык мінімальную. Да таго ж забарона ўрадам фінансавання кандыдатаў адштурхнула значную частку прадпрымальнікаў ад падтрымкі дэмакратычных партый.

Але пройгрыш нацыянал-дэмакратычных сіл азначае змену ўрадавай палітыкі не на карысць прыватнага бізнесу. І таму сёння многія маіх калег і партнёраў у бізнесе адкрыта шкадуюць аб тым, што ў свой час не падтрымалі сілы, якія маглі б стварыць альтэрнатыву пазіцыі сённяшняга ўрада ва ўсім, пачынаючы ад дзяржаўнай сімволікі і канчаючы эканамічным заканадаўствам.

Таму, карыстаючыся магчымасцю, мне хацелася б праз вашу газету звярнуцца да такіх палітыкаў, як Зянон Пазьняк, Генадзь Карпенка, Станіслаў Шушкевіч, да лідэраў Аб'яднанай дэмакратычнай і Сялянскай партый, каб сказаць ім: вы атрымалі паразу ўжо двойчы: на прэзідэнцкіх выбарах і на выбарах у Вярхоўны Савет. Трэці пройгрыш будзе каштаваць усім нам занадта дорага. Таму сёння нацыянальным палітыкам і нацыянальнаму бізнесу неабходна аб'яднаць свае намаганні, каб не дапусціць ператварэння Беларусі ў аўтарытарную дзяржаву. Бо нацыянальнае адраджэнне, палітычныя і эканамічныя свабоды — толькі часткі адзінага працэсу ўсталявання дзяржаўнасці нашай радзімы. Разумеючы гэта, мы, прадпрымальнікі, гатовыя заплаціць за свабоду нашага народа і краю патрэбную цану.

Распытваў У.ПАНАДА.

Чыталі?

Славутыя і невядомыя — у «Крыніцы»

Колькі разоў ужо прагглі «ліквідаваць дашчэнту мову, якой Купала гаварыў». Але, няйначай Боскай ласкай, яна, як птушка фенікс, выходзіла з агню, з папялішча, выходзіла не адна... Забароненая, наша мова спараджала творы, якія сталі перламі беларускай і, пэўна ж, сусветнай літаратуры. «Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе»... Традыцыя працягваецца...

І вось адроджаная «Крыніца» — штомесячны культуралагічны часопіс — аддае 53 старонкі славутаму «Сказу пра Лысую гару». У сёлетнім першым-другім нумары часопіса надрукаваны не толькі «кананічны тэкст» паэмы ды шмат нататак і артыкулаў пра «загадку, якую ніхто пакуль не адгадаў...», але і фотаздымак постаці Францішка Ведзьмака-Лысагорскага, так, толькі постаці. На жаль, «Крыніца» месціцца ў такіх цесных пакойчыках, што рэдакцыйны фатограф здолеў сфатаграфаваць толькі спіну славутага аўтара, калі той гутарыў з супрацоўнікамі часопіса.

Як бачым, «крынічанцы» вырашылі абвергнуць радкі

«А хто пісаў паэму гэту,
І дзе тварыў ён, і калі —
Навечна канула у Лету —
І толькі бурбалкі пайшлі!

У «Крыніцы» надрукавана і гутарка з Францішкам Ведзьмаком-Лысагорскім, які сцвярджае: *— «...можаце давесці да ведама сваіх чытачоў, што менавіта — і толькі! — у часопісе «Крыніца» неўзабаве адбудзецца самавыкрыццё і падрабязнае прызнанне Ведзьмака-Лысагорскага. Словам, споведзь. Падрыхтаваны ўжо «вybуховы матэрыял»...*

А што ж на астатніх 58-і старонках — у раздзелах «Я», «Мы», «Наш», «Яны»? Пра Льва Сапегу у першым раздзеле напісаў Іван Саверчанка. Ён скупымі радкамі, але ёмка накрэсліў асобу знакамітага канцлера (з гэтага ня ўрок для тых, што наш літаратуразнаўца і гісторык піша пра яго кнігу).

Канцлер Леў Сапега — які то быў чалавек! Менавіта ён разам з А.Валовічам і К.Радзівілам-Перуном дамогся ў 1581 годзе ўтварэння Трыбуналу — найвышэйшага апеляцыйнага суда Вялікага Княства Літоўскага, дамогся зацвярджэння новага Статута (Статута рэдакцыі 1588 года) — «найдасканалейшага ўва ўсёй Еўропе кодэксу законаў», што «стаўся гарантам эканамічнай, палітычнай, культурна-этнічнай і дзяржаўнай незалежнасці Беларускага (літоўскага) гаспадарства». А як Леў Сапега бараніў нашу мову!

Тут жа Алесь Разанаў «са старабеларускай узнавіў» Сапегаву славутую Прадмову да Статута 1588 года: *«Мудрыя людзі ўсіх стагоддзяў сыходзіліся на думцы, што ўсякім — калі б яно ні ўтварылася — гаспадарстве дастойнаму чалавеку нічога не можа быць даражэй за вольнасць. Затое няволя яму настолькі агідная мае быць, што не толькі маёмасцю, а і смерцю ён адганяць ад сябе павінен. Таму і не дзіўна, што людзі, якія сябе шануюць, каб не падпасці пад панаванне чужацкае, у змаганні з усякім наспротнікам не шкадавалі ні скарбаў сваіх, ні горлаў. Калі ж аднак здаралася траціць волю, дык усё роўна паводле парадкаў чужых не хацелі жыць... І калі сорам другому якому народу законаў сваіх не ведаць, то нам пагатоў — бо маем законы, што пісаны не чужой, а сваёю моваю, і заўжды паведаць можам, што трэба, зрэшты, нам для адпору крыўды».*

У раздзеле «Наш» пададзены партрэт вядомага беларускага эміграцкага дзеяча, старшыні Беларускага культурнага згуртавання, сябра Беларускай Цэнтральнай Рады Аўгена Калубовіча і яго эсэ «Паводле летапісу Магілёва». А яшчэ ў гэтым нумары «Крыніцы» надрукаваны апавяданні Леаніда Дранько-Майсюка (раздзел «Мы») і пачатак рамана Патрыка Зюскінда «Парфума» (пераклад з нямецкай Васіля Сёмухі).

З.С.

Беларуская мова — мова навукі

Новая Тэрміналагічная камісія

27 чэрвеня ў Міністэрстве адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь адбыўся першы пленарны сход сяброў Тэрміналагічнай камісіі, створанай паводле загада міністра адукацыі і навукі спадара Васіля Стражава ад 17 траўня 1995 года за № 178.

У канферэнц-зале сабраліся выкладчыкі шмат якіх ВНУ краіны, навуковыя супрацоўнікі Акадэміі навук Беларусі ды Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Францішка Скарыны, сябры Тэрміналагічнай камісіі Таварыства беларускай мовы. Сама перш з кароткай прамовай выступіў спадар міністр. Мэта ягонага выступу, як ён сам сказаў, — азнаёміць сяброў камісіі з пазіцыяй міністэрства. Прысутныя не толькі ўважна слухалі словы спадара Стражава («міністэрства падтрымлівала і будзе падтрымліваць беларускую мову»), але і пра шмат што пыталіся ў міністра. На жаль, не ўсе былі задаволеныя адказамі.

Падрабязней пра Тэрміналагічную камісію і вынікі яе першага пленарнага пасяджэння, па пытанні спадару Стражаву і ягоныя адказы мы распавядзем у наступным нумары.

П.П.

Сховішча гістарычнай праўды

Сёлета ў чэрвені Беларускаму дзяржаўнаму архіву-музею літаратуры і мастацтва споўнілася 35 гадоў. З гэтай нагоды наш карэспандэнт сустрэлася з яго дырэктарам Запартыка Ганнай Вячаславаўнай.

— Ганна Вячаславаўна, як узнік ваш архіў?

— Наша ўстанова была ўтворана ў чэрвені 1960 года. Тады яна мела назву Цэнтральны дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва БССР. Першы фонд, які паступіў у архіў, быў фонд Міхася Машары. Пасля — дакументы Міхася Васілька, Міколы Засіма, Алеся Жаўрука, Якава Брайцава. У студзені 1976 года архіў пераўтвараўся ў архіў-музей. Гэта дало магчымасць павялічыць штаты, забяспечыць больш шырокае выкарыстанне фондаў — праз арганізацыю выстаў, складанне календароў і г.д. Пачалі ствараць музейную экспазіцыю. Але магчымасці ў нас вельмі сціплыя — і ўсё з-за адсутнасці адпаведнага памяшкання...

— Дарэчы, Ганна Вячаславаўна, раскажыце пра тыя памяшканні, якія займаў і займае ваш архіў. Гэта ж усё — гістарычныя будынкі...

— Да 1992 года мы знаходзіліся ў будынку Екацярынінскай царквы. Цяпер там дзейнічае Петрапаўлаўскі сабор. А мы пераехалі ў памяшканне былога касцёла бернардзінцаў. На гэты будынак таксама прэтэндавалі і прэтэндуюць вернікі — каталікі. Прасілі яго і уніяты. Але памяшканне стала перабраблёнае менавіта для архіва яшчэ ў часы Расійскай імперыі — калі пасля разгрому паўстання Кастуся Каліноўскага ў каталікоў адбіралі храмы. Дарэчы, ёсць паданне, што менавіта ў гэтым кляштары была апошняя цытадэль абароны паўстанцаў Каліноўскага — інсургенты трымаліся тут, калі па ўсёй краіне паўстанне было ўжо разгромленае... І нечакана мы атрымалі пацвярджэнне гэтай легенды. У фондзе Каруся Каганца захоўваўся нататнік, які належаў бацьку паэта. У ім мы знайшлі аркушык, датаваны 3 верасня 1874 года. Занатавана і месца запісу — «У Мінскім кляштары бернардзінцаў». На аркушыку — прозвішчы ўдзельнікаў паўстання з пазначэннем іх лёсу — хто загінуў, каго выслалі ў Сібір, хто знік без вестак... Не ўсё паддаецца прачытанню, ёсць зашыфраваныя месцы. Нешта глыбока сімвалічнае, ледзь не містычнае, у тым, што гэтыя запісы вярнуліся сюды, дзе былі зробленыя...

— Ганна Вячаславаўна, а якім чынам папаўняюцца вашы фонды?

— Ёсць два шляхі паступлення матэрыялаў — з прыватных архіваў пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, артыстаў. Мы вядзём перамовы з самім фондаўладальнікам або яго наследнікамі. Прычым стараемся праяўляць ініцыятыву самі — шукаць, сачыць за лёсам дакументаў... Другі шлях — гэта калі нам перадаюць свае архівы пасля вызначанага тэрміну захоўвання розныя ўстановы — тэатры, выдавецтвы, творчыя саюзы, часопісы, газеты...

— А па якіх крытэрыях Вы вызначаеце, варты дакумент захоўвання ці не?

— Гэтым у нас займаецца экспертная камісія — а ў ёй працуюць кампетэнтныя спецыялісты. Тут да месца будзе сказаць, што ўвогуле ў нашым архіве склаўся сапраўдны творчы калектыў. Тут няма выпадковых людзей. Да таго ж, за такую мізэрную зарплату выпадковы чалавек і працаваць не будзе. Усё ж хочацца адзначыць такіх нашых супрацоўнікаў, як Харавец Ганна Дзмітраўна, Сахароўская Наталля Георгіеўна, Данекіна Валянціна Ягораўна, Жукава Ганна Мікалаеўна, Кекелева Таццяна Віктараўна, Бярэйшык Вольга Іванаўна, Мірановіч Ірына Іванаўна... Хочацца падзякаваць і тым руплівіцам, якія дапамагаюць нам апрацоўваць дакументы на грамадскіх пачатках. Гэта навуковец Віталь Скалабан, пісьменнік, даследчык Янка Саламевіч, мастацтвазнаўца мастацкага музея Надзея Вусава... Вялікая падзяка і Сяргею Грахоўскаму, Янку Брылю, Паўлу Пруднікаву, Сяргею Панізьніку...

— Раскажыце пра сённяшні дзень архіва-музея, пра задумы на будучае.

— Сёння наш архіў — гэта 395 фондаў. Значыць, 395 вялікіх і малых музеяў, 395 гісторый лёсаў. У нас захоўваецца 25 тысяч кніг, сярод іх вельмі рэдкія выданні, 16,5 тысячы газет і часопісаў. Пяць гадоў рыхтаваўся даведнік па фондах БДАМЛІМ, але ўжо падрыхтаванае выданне надрукаваць не можам — няма сродкаў. Ёсць толькі паўтоны загадзя падрыхтаванай паперы, якая ўжо зжаўцела. Унікальныя матэрыялы захоўваюцца ў гэтых сценах — адзін толькі архіў Лукі Бэндэ чаго варты! 1506 адзінак — колькі рэдкіх выданняў! Колькі дакументаў і рукапісаў, што належалі рэпрэсаваным пісьменнікам... Нядаўна паступіў архіў Паўліны Мядзёлкі — дзякуючы Максіму Танку і Сяргею Законнікаву... Ідзе гаворка аб стварэнні народнага архіва Вялікай Айчыннай вайны — што можа лепей расказаць пра яе падзеі, чым звычайныя салдацкія «трохкутнікі»-лісты, франтавыя фотаздымкі, іншыя дакументы, што належалі «простым» людзям. Праводзілі выставы да юбілеяў дзеячаў культуры — Казіміра Сваяка, Язэпа Лёсіка, Міхася Забэйды-Суміцкага... Сумесна з іншымі мерамі зрабілі выставу «Беларусь, Германія. 20-я гады». Да 50-годдзя Перамогі прайшла выстава ў Нацыянальнай бібліятэцы. І вось 31 траўня ў Доме літаратара — наша юбілейная вечарына...

Архівы чамусьці па-за ўвагаю грамадства. Але падумайце — якую велізарную ролю ў гісторыі народа яны адыгрываюць! Гэта — не толькі памяць для нашчадкаў. Гэта — невычэрпная крыніца для навуковых адкрыццяў, сховішча гістарычнай праўды.

— Што ж, Ганна Вячаславаўна, дзякуй Вам за гутарку, жадаю далейшага плёну ў высакароднай і такой важнай справе. Віншую ўвесь калектыў БДАМЛІМ з юбілеем.

Распытвала Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Кола сям'і

Здароўе

Таццяна ФАМІНА,
кандыдат медыцынскіх навук

Павышэнне тэмпературы цела

Гэтая з'ява — вынік утварэння празмернага цяпла і паніжэння яго траты пры дражненні цэнтраў тэрмарэгуляцыі ў мозгу. Тэмпература ад 37 да 38 градусаў па Цэльсію называецца субфебрыльнай (падліхаманкавай), ад 38 градусаў і вышэй — фебрыльнай (ліхаманкавай), прычым, з апошняй адрозніваюць памяркоўную — ад 38 да 39 — і высокую — ад 39 градусаў і вышэй.

Нязначнае павышэнне тэмпературы — ад 37°С да 37,5°С — можа быць у дзяцей і дарослых з недасканалай тэрмарэгуляцыяй ад перагрэву на сонцы.

Часцей жа павышэнне тэмпературы цела — прыкмета хваробы, пераважна заразнай, калі цэнтр тэрмарэгуляцыі атручаны рэчывамі, што ўтвараюцца ў выніку дзейнасці мікробаў ды вірусаў. Нязначная тэмпература можа быць прыкметай хваробы, пра якую чалавек яшчэ не ведае, бо яна яшчэ не мае характэрных сімптомаў (пачатковая стадыя сухотаў, запаленне прыдаткаў маткі, хранічны халецыстыт, гаймарыт ды інш.). Пры лячэнні гармонамі, асабліва сінтэтычнымі палавымі, таксама магчымы падобны стан. Тое ж можа быць і пры павышэнні функцыі шчытападобнай залозы; пры цукровым дыябеце яна звычайна сведчыць пра існаванне ў арганізме прыхаваных крыніц інфекцыі (у нырках, лёгкіх, жоўцевым пухіры).

Хваробы нервовай сістэмы пераважна суправаджаюцца нармальнай тэмпературай. Вось толькі інсульты, зрэдку пухліны, пашкоджанні мозгу і поліміязіты могуць выклікаць павышэнне тэмпературы цела нават да ліхаманкавага стану. Асабліва значнай можа быць тэмпература пры пашкоджанні падбугорнай вобласці мозгу (медыкі часам называюць яе гіпаталамічнай). Пры гэтым захворванні тэмпература цела ўзнімаецца рэзка, суправаджаецца дрыжыкамі, што паступова становіцца відавочным: хворы калоціцца вельмі моцна. Тэмпература цела ўзнімаецца да 40—42 градусаў, павышаецца крывяны ціск, часцей б'ецца сэрца, адчуваецца боль у вобласці сэрца і ў галаве. Такое пашкоджанне падбугорнай вобласці мозгу — вынік не траўмы, запалення, раздражнення прадуктамі распаду пухлінаў, парушэння кровазвароту ў гэтай вобласці, а таксама раздражнення прадуктамі няправільнага рэчыўнага абмену, калі чалавек хварэе на цукровы дыябет ці на іншыя хваробы эндакрыннай сістэмы. Прыступ заканчваецца — хворы пачынае адчуваць, што яму стала цяплей; ён шмат мочыцца, зніжаюцца да нармальнай тэмпература і крывяны ціск, спакайней пачынае біцца сэрца.

Калі ў чалавека раніцой тэмпература нармальная, а пад вечар рэзка павялічваецца да 40—42 градусаў ды пачынаюцца дрыжыкі, і так паўтараецца шмат дзён, можна меркаваць, што дзесьці ўтвараецца гнаінік, які клінічна напачатку зусім не выяўляецца.

Асаблівасці павышэння тэмпературы цела ў дзяцей. Дзеці лягчэй, чым дарослыя, пераносяць нязначную — да 38 градусаў тэмпературу. Адначасна з павышэннем тэмпературы павялічваецца сухасць скуры, яна бялее — парушаецца водна-солевы абмен, часцей б'ецца сэрца, дзеці адмаўляюцца ад ежы, зніжаецца ўласцівасць пераправаць і засвойваць ежу, зніжаюцца ныркавыя функцыі — дзеці працяглы час не мочацца. (Калі ў такі момант зрабіць аналіз крыві, то можна перакананца, што ў ёй павысілася колькасць цукру). Працяглая высокая тэмпература выклікае ў дзяцей зацямненне свядомасці, яны ўзбуджаюцца, трызняць, могуць узнікаць сутаргі.

Дапамога пры павышэнні тэмпературы цела. Калі тэмпература не дасягнула 38,5 градуса па Цэльсію, то яе можна разглядаць як абарончую рэакцыю арганізма. Пры такой тэмпературы не трэба выкарыстоўваць лекавыя сродкі, але неабходна шчодра паіць гарбатай з малінамі (мёдам, лімонам, смуродзінамі). Калі пры павышэнні тэмпературы хворага калоціць, яго трэба грэць: накрыць цёплай коўдрай, пакласці ў пасцель, пераважна да ног, грэлкі, напаіць гарачай гарбатай з малінамі. Калі тэмпература перавысіць 38,5 градуса, пажадана пакласці на галаву хворага грэлку з сцюдзёнай вадой, але як толькі тэмпература пачне зніжацца, яе трэба прыняць.

Калі ж тэмпература не суніmаецца, дайце хвораму адначасна з шчодрым піццём аспірын, плідол (парацэтамол). Пры вельмі высокай тэмпературы (40—42 градусы) хворы «гарыць», а таму неабходна яго раскрыць, працерці скуру спіртам або гарэлкай, што часам збівае тэмпературу на непрацяглы час — 20—30 хвілін. Калі гэта не дапамагае, пакладзіце халодны кампрэс уздоўж буйных крывяносных сасудаў (на локцевыя згібы, на сцёгны каля пахвіны, на шыю ўздоўж шчытападобнага храстка); можна выкарыстаць клізмы з халоднай вадой, абдзіманне вентылятарам. Хвораму дайце растоўчаную таблетку амідапірыну або аспірыну і паіце. Пры працяглай высокай тэмпературы выклікайце «хуткую дапамогу».

Калі ж рэзкія ваганні тэмпературы працягваюцца некалькі дзён, абавязкова трэба паказаць хворага дактару, каб часам не прагледзець пачатак захворвання.

У выпадку, калі хворы моцна пацее, яго выціраюць сухім ручніком, мяняюць бялізну. А таму што пацене памяншае тэмпературу цела, то нельга надоўга раскрываць хворага, а тым болей здымаць з яго коўдру, нават і тады, калі ён скардзіцца, што яму горача. Калі ж значнае пацене спыняецца, цела хворага трэба абцерці вадой папалам з адэкалонам, атуліць яго, каб яму было цёпла, і неабходна даваць яму ўдосталь піцво.

Уражанні

Мікола КАПЫЛОВІЧ

Слабае сэрца

— Служыў я дэсантнікам. Дэмабілізаваўся і дамоў прыехаў. І раптам мяне выклікаюць у міліцыю. Сам начальнік. Так і так, мне кажа, чалавек ты падрыхтаваны, ведаеш і бокс, і баявое самба. Нам такія хлопцы пазарэз трэба. Ідзі да нас служыць. У міліцыю. Памуляўся я, падумаў, а потым згадзіўся. І вось пайшоў у першы свой нарад. Вуліцы патруляваць. Зайшоў з сваім калегаю пагрэцца ў апорны пункт. А там раптам свайго суседа бачу. З каторым разам некалі ў школу хадзіў. На танцы таксама. Да арміі. Карацей, сябравалі з ім. Стаіць ён перад капітанам і апраўдваецца. І просіць у яго прабачэння, што выпіў на вяселлі. А капітан ужо пратакол на суседа строчыць. Потым адарваўся ад сваёй пісаніны і — да мяне: «Зрабі, Ігар, у затрыманага вобыск!» Загадвае. Ну, загад ёсць загад. Падыходжу да сябра і пачынаю яго аблапваць, кішэні вывaрочваць. Ён зірнуў на мяне і кажа: «Толя, а як ты будзеш заўтра мне ў вочы глядзець? Няўжо і ты сабакам зрабіўся?» Мяне ўсяго ўсярэдзіне аж перавярнула ад яго слоў. Рукі ў мяне самі апусціліся, нібы абвялі. Не стаў больш абмацваць суседа. А на другі дзень рапарт падаў на звальненне. Не магу, мауляў, служыць у міліцыі. Сэрца слабае. Ледзь адпусцілі.

Хоць і кахала

— Чаму я з Сяргеем развялася? Распуснікам ён быў, бабнікам. Ведаеш, што ён утварыў? Аднойчы ўлетку паехаў быў на дачу. На выхадныя. Дзень няма дома, два. Хвалююся. І раптам суседка да мяне прыбягае: «Твая дача згарэла. Разам з Сяргеем! Яго косточкі пад галавешкамі знайшлі». Мяне адразу памарака схапіла. Ледзь у памяць прывялі. Дачу я не так шкадавала, як Сяргея. Бо моцна кахала яго. Зграбла на папялішчы яго косточкі і пахавала. Кожны дзень хаджу на яго магілку і румзаю. І дома месца сабе ад гора не знаходжу. І раптам — звоняць. Адчыняю дзверы — Сяргей на парозе стаіць. Жывы і здаровы. Я зноў страціла прытомнасць, калі ўбачыла яго. Ледзь адкачалі. Два дні потым не верыла сваім вачам, што бачу яго. А потым вось што даведалася. Сам ён расказаў. Прызнаўся. Тады ён на дачу паехаў не адзін, а нейкую краль з сабою прыхапіў. Піў з ёю два дні, спаў. А калі віно скончылася, пабег у вясковы магазін, каб яшчэ купіць. І там у чарзе пабіўся з вясковымі хлопцамі. Яго і забрала міліцыя. А суд пятнаццаць сутак прысудзіў. А яго п'яная краля закурыла і спаліла дачу. Разам з сабою. Яе косткі і былі пад галавешкамі. Якія я пахавала потым. Дык, скажы, хіба я магла пасля гэтага жыць разам з Сяргеем? Не. Вось і развялася з ім. І цяпер вось гарую адна. І зноў плачу, што так выйшла.

Мухамор

— Ідзе каторы грыбовік па лесе, убачыць мухамор — і нагою яго. А я заўсёды спынюся і падыму. І каторы раз поўны кашэль мухамораў дамоў прывалаку. Калі ў лесе іншых грыбоў не знайду. Смяюцца з мяне людзі, калі бачаць, што атруту ў лесе збіраю. З сябе яны смяюцца, скажу табе. Мухамор — самы карысны грыб. Яго і каровы, і ласі, і дзікі ядуць. Каб розную пошасць з свайго нутра выгнаць. Лечацца мухаморамі, скажу табе. І я даўно парыў бы косці ў сырой зямельцы, калі б не мухаморамі лячыўся. Раны ніяк не зажывалі на нагах, калі вярнуўся з вайны. Слізіліся, гнаіліся. Хацелі іх адрэзаць. Пачаў я да іх адвар з мухамораў прыкладаць. Прымочкі рабіць. І вылечыўся. Зацягнула раны. І цяпер, бачыш, па лесе як той лось гойсаю. Вось які карысны грыб мухамор, скажу табе.

Кола сям'і

І канфліктаваць трэба культурна

Відаць, варта пагадзіцца з тым, што ў любой чалавечай супольнасці не абысціся без супярэчнасцяў, а значыць канфліктаў. Больш таго, псіхолагі прызнаюць, што гэта ў пэўнай ступені карысна, бо толькі спаборніцтва інтарэсаў і меркаванняў здольнае развіваць грамадства і асобу. Калі гэта забараняць сілай, то непазбежна наступае ўсеагульная апатыя і застой, з аднаго боку, і правва дзікіх хуліганскіх учынкаў — з другога. Што даказала яскрава камуністычнае панаванне, рэцыдывы якога мучаюць Беларусь і зараз. Так што памылкова рабіць выгляд, што ніякіх супярэчнасцяў няма, нічога не адбываецца, усе задаволеныя рэчаіснасцю. Куды лепш распрацаваць правілы, як «канфліктаваць», памятаючы заўважаныя псіхолагамі наступныя заканамернасці:

У цяжкім бескампрамісным канфлікце не бывае пераможцаў — прайграюць усе, абодва бакі. Таму лепей не параўноўваць ступень вінаватасці («Ён болей вінаваты, а я ўвогуле ні пры чым...») Бярыце на сябе першы крок — гэта якраз паказчык вашай сілы характару, годнасці і самапавагі.

Калі гэта на працы, у калектыве, то пачніце размову (прычым вельмі спакойна) з апісання канкрэтнай сітуацыі, якая вам здаецца несправядлівай, пастарайцеся пры гэтым быць як мага аб'ектыўнымі. Чым падрабязней, дэталёва вы будзеце пра гэта гаварыць, тым лепей. Калі магчыма, прыводзьце канкрэтныя прыклады: «Мы дамовіліся, што за гэту працу вы мне заплаціце столькі і столькі, а цяпер называеце іншую суму», «Вы некалькі разоў зрабілі мне заўвагу ў прысутнасці ўсіх супрацоўнікаў...»

Скажыце ўсё, што вы адчуваеце ў сувязі з гэтай сітуацыяй. Мноства канфліктаў паміж людзьмі ўскладняецца наяўнасцю думак і пачуццяў, што не былі выказаныя. Іншым разам толькі адно іх праясненне, абмен гэтымі прыхаванымі пачуццямі дазваляе значна змякчыць канфлікт, а то і вырашыць яго. Старайцеся ўжываць простыя словы — «разлаваецца», «пакрыўдзіцца», «спалохацца», «калі вы гэта сказалі, я страшэнна разлавалася...»

Потым пастарайцеся ўважліва выслухаць супрацьлеглы бок — гэта, відаць, самае цяжкае. Вы павінны памятаць, што вашы меркаванні розныя і гэта натуральна, з-за гэтага і ўзнік канфлікт. Таму ўспрымайце гэтыя выказванні не як ісціну, а як вынік вопыту суразмоўцы. Паўторым: пастарайцеся быць дысцыплінаваным слухачом — не перабівайце, не пярэчце, не спрачайцеся, асабліва сходу. Пакажыце суразмоўцы, што вы сапраўды ўважліва яго слухаеце, а не проста робіце такі выгляд, што імкняцеся дасягнуць згоды. Не саромцеся падкрэсліць гэта знешне — рухам галавы, просьбаю прывесці канкрэтны прыклад — вам гэта дапаможа выслухаць, а суразмоўцы — настроіцца на шчырую размову. Калі канфлікт вельмі сур'ёзны, звярніцеся да «нейтральнага» чалавека, які змог бы вам дапамагчы без зрываў выслухаць адзін аднаго.

Цяпер вельмі карысна разабрацца ў прыхаваных думках.

Калі ўсчаўся канфлікт, вельмі карысна своечасова разабрацца ў прыхаваных думках. «Прыхаваныя думкі» — гэта здагадкі, апаскі, меркаванні аб пачуццях і думках другога. Каб пераканацца, сапраўдныя яны ці надуманыя, лепей за ўсё спытацца пра гэта прама. Калі ж вас у сваю чаргу пытае пра тое ж суразмоўца, пастарайцеся самі быць дастаткова шчырымі, таму што здагадкі, як правіла, маюць пад сабой рэальную глебу. «Мне здаецца, што вы не задаволены маёй працай, хочаце, каб я звольніўся!» — «Так, мне сапраўды не падабаецца, што вы кожны дзень пакідаеце рабочае месца раней дазволенага, але я вельмі высока стаўлюся да вас як спецыяліста».

Стрымайцеся, не каменціруйце, падводзячы рысу пад вашай размовай. Вылучце тыя пункты, па якіх вашы думкі, пачуцці, дзеянні, супалі, і пытанні, па якіх яны адрозніваюцца, — абмяжуйце зону супярэчнасцяў.

Пастарайцеся выказаць канкрэтныя прапановы па змене сітуацыі, паводзін і г.д. «Я прашу вас не крытыкаваць мяне ў прысутнасці іншых», «Я хацеў бы, каб за гэту працу мне плацілі ў адпаведнасці з нашай ранейшай дамовай».

Напрыканцы размовы абмяркуйце, што зменіцца, калі гэтыя змены адбудуцца. Не варта пагражаць і ставіць ультыматум: вопыт паказвае, што пазітыўныя перспектывы больш прываблівыя. Азначце, якая «ўзнагарода» з вашага боку будзе, калі чалавек зменіць свае паводзіны ў адпаведнасці з вашай просьбай.

«Калі ты будзеш прыходзіць дадому раней, я не буду нервавацца і змагу дапамагчы табе ў тваёй працы».

Такі спосаб вырашэння канфлікту патрабуе ад вас пэўнай рашучасці. Але калі вы будзеце шчырымі і чэснымі ў гэтай размове, вашы адносіны не сапсуюцца, а стануць больш паважлівымі.

У складаных выпадках можна нават саставіць «сцэнар» і адрэпеціраваць яго — бо ўсё роўна ж у галаве «пракручваюцца» гэтыя магчымыя размовы («А я яму скажу... А ён мне адкажа...»). Дык лепей гэтыя думкі скіраваць у канструктыўнае рэчышча!

Добрае вырашэнне канфлікту можа адкрыць новыя магчымасці ў вашых узаемаадносінах.

Па матэрыялах сучасных амерыканскіх псіхалагічных даследаванняў.

Рэдзьярд Кіплінг і феномен брытанскага нацыянальнага характару

Народ Англіі прыцягнуў да сябе асаблівую ўвагу блізкіх і далёкіх суседзяў з таго часу, калі насуперак бедам і перашкодам спачатку пазбавіўся іншаземнага прыгнёту, а затым стаў настолькі магутным і заможным, што з ім вымушаны былі лічыцца ўсе дзяржавы сусвету. Даследчыкі вызначылі некалькі прычын гэтага феномену, у тым ліку ці не адну з галоўных — своеасаблівасць брытанскай сям'і і ўрэшце брытанскага нацыянальнага характару, выхаванага адпаведным выхаваннем. Адным з тых, хто здолеў паказаць сутнасць гэтага выхавання літаратурнымі сродкамі, лічыцца знакаміты Рэдзьярд Джозэф Кіплінг (1865—1936), якога ў савецкі час ахрысцілі англійскім рэакцыйным пісьменнікам і апалагетам брытанскага імперыялізму. Нават ягоную кнігу «Маўглі», выдадзеную ў 1896 годзе, яшчэ ў 50-я гады ў савецкіх універсітэтах называлі... антысавецкім творам, таму што яе любімага ўсімі героя пераследуе зграя чырвоных сабак. Потым расійскія перакладчыкі «перафарбавалі» іх у «рыжых», а адпаведнаму раздзелу далі назву «Дзікія сабакі».

Верш Рэдзьярда Кіплінга, які прапануецца ўвазе чытачоў, лічыцца паэтычнай квінтэсэнцыяй тых «правілаў паводзін джэнтльмена», на якіх гартаваўся брытанскі нацыянальны характар.

Рэдзьярд КІПЛІНГ

Калі

Сабой валодай — хай натоўп кляне
Цябе за ўласныя ж манеры.
Вер у сябе насуперак мане
І не крыўдуй на малавераў.
Чакай свой час, цярпі і ў тлуме.
Няхай ілгуць — не падыходзь да іх.
Даруй усім, і адная не думай,
Што ты мудрэйшы за другіх.
Вучыся думаць — бойся летуценняў:
Ёсць і ў філасофаў імжа.
Ці хваляць, ці клянуць — няма адценняў,
Не забывай — усё гэта ілжа.
Застанься нем, калі тваім жа словам
Абылганым балваняць прастакоў.
Калі жыццё разбурана, то знову
Павінен ты падняць усё з асноў.
Калі гуляць — пастаў у спадзяванні,
Што ашчаджаў і нажываў гарбом.
Не пашануе, лясне ўсё дазвання —
Не пашкадуй, не будзь рабом.
Умей прымусіць нервы, сэрца, цела
Табе служыць, калі ў грудзях
Даўно ўсё пуста, усё згарэла.
Сабе скажы: «Ідзі. Не скончан шлях».
Будзь простым, размаўляючы з царамі,
Натоўпу не кажы маны.
Будзь цвёрдым з ворагам і гэткім жа з сябрамі,
Няхай з табою лічацца яны.
Умей напоўніць сэнсам гожым
Сваё жыццё, імклівы век,
Тады сусветам уладарыць зможаш,
Тады, мой сын, ты будзеш чалавек.

Па-беларуску пераклаў Эрнэст ЯЛУГІН.

Жорж СІМЕНОН

Жанчына — маці — Дом

Працэс распаду сям'і, што была доўгія вякі асновай чалавечага існавання, паглыбляецца. Гэта заўважаюць, а таму пэўны год абвяшчаюць Годам жанчыны. Якой жанчыны? Той, што імкнецца быць маці сям'і, гаспадыняй дамашняга ачага, а вельмі часта і галавою сям'і, ці той, што прагне эмансіпацыі, у сем раніцы пакідае мужа і дзяцей у кватэрцы дзяшовага муніцыпальнага дома, імчыць на чыгуначную станцыю, паўгадзіны, калі не ўсе сорак пяць мінут трасецца ў цягніку, перасаджваецца ў метро ці аўтобус і потым сядзіць да шасці вечара на адным месцы, быццам прышытая, робячы аднастайныя механічныя рухі і не маючы ўвесь гэты час кантакту са сваімі блізкімі?

А шостай вечара паездка ў адваротным накірунку — да таго, што даўней называлася домам, а зараз дзяшовай муніцыпальнай кватэрай для рабочых. А дзе былі дзеці ўвесь гэты час? У безыменных яслях пад прыглядам жанчыны, якая мае нейкі дыплом, што зусім не азначае наяўнасці мацярынскіх пачуццяў, і каторая проста не можа ставіцца па-мацярынску да сарака, а то і пяцідзесяці малых?

А калісьці існавалі бабулі, цёткі, сваячкі, суседзі.

Сваіх суседзяў людзі цяпер не ведаюць. Цёткі працуюць у горадзе, размешчаным на адлегласці двухсот ці трохсот кіламетраў, і ў іх тыя ж самыя праблемы. Ну, а для бабуль у муніцыпальных кватэрках няма месца. Яны альбо працягваюць жыць у сваім дамку дзе-небудзь у вёсцы, альбо ад іх пазбавіліся, змясціўшы ў дом грамадскага догляду.

Яны таксама адзінокія, як іхнія дзеці і ўнукі.

Памятаю, калі я жыў у Канектыкуце (ЗША. — **Рэд.**), уладальнікі некалькіх фабрык, галоўным чынам ткацкіх, вырашылі перабазіравацца ў паўднёвыя штаты, дзе ім бясплатна адводзілі неабходныя землі пад цэхі і вызвалялі ці то на дзесяць, ці то на дваццаць гадоў ад падаткаў.

Літаральна з дня на дзень перад рабочымі павінен быў паўстаць выбар: ехаць з фабрыкай, гэта значыць адарвацца ад каранёў, ці застацца без работы.

Праз дваццаць гадоў я бачу, як тое ж самае адбываецца ў Францыі. Больш не існуе ні роднай вёскі, ні роднага горада, ні роднай правінцыі. Усё пакідаецца разам — не толькі старыя, не толькі сябры, але і звычкі, і ўсё астатняе, што састаўляла сэнс жыцця.

І — следам за фабрыкай.

Дзе ж сам чалавек у гэтым бегу наперад? У бегу, што вядзе не толькі да забруджвання рэк і лясоў у самых прыгожых мясцінах, але і рве сувязі, што ствараліся многімі вякамі...

...То якая можа быць сям'я, якая можа быць сямейная пара, калі жанчына з раніцы да вечара занятая не дома, калі ёй даводзіцца выбіраць, ці ісці за мужам туды, куды кліча яго работа, ці ехаць туды, куды клічуць яе свае ўласныя абавязкі?

А як з дзецьмі?

Хутка, верагодна, імі паспрабуе заняцца, як у Спарце, дзяржава. Яслі — гэта ўсяго толькі сурагат сям'і. Дзяржава ўжо бярэ на сябе клопат аб дзецях і кіруе юнымі розумамі двух- і трохгадовых дзяцей.

Гэта прагрэс?.. Але прагрэсам я гэта назваць не магу. Сапраўдным ён можа быць толькі ў гармоніі чалавека з ягоным асяродкам.

З кнігі «Un banc an soleil» («Лаўка на сонейку»).

Мудрыя гавораць...

Луцый Аннэй Сенэка (каля 4 да н.э. — 65 н.э.) — адзін з самых вядомых пісьменнікаў Старажытнага Рыма. Ён праславіўся як філосаф, аўтар трактатаў, у якіх адлюстраваныя асноўныя прынцыпы рымскага стаіцызму. Акрамя таго, быў Сенэка і буйным трагічным паэтам, чые творы паспрыялі ўсталяванню еўрапейскай драмы Адраджэння і Новага Часу. Нямала цікавага вядома і пра жыццё самога філосафа, якое нярэдка адхілялася ці проста супрацьстаўлялася яго дэкляраваным жыццёвым прынцыпам. Дастаткова ўспомніць, што Сенэка быў выхавацелем Нерона, крывавага Рымскага імператара, і шмат удзельнічаў у палітычных падзеях таго часу. Тым не менш, мудрасць Сенэкі, захаваная ў рукапісах, не траціць сваёй вартасці. Прапануем чытачам рубрыкі «Кола сям'і» падборку цытатаў са знакамітага этычнага твора філосафа «Маральныя лісты да Луцылія».

Нярэдка вучаць спадмана тым, што спадманы баяцца, і падазрэннямі даюць права быць здраднымі.

Няхай той, хто ўвойдзе ў наш дом, дзівіцца на нас, а не на наш посуд.

Вялікі той чалавек, хто гліняным посудам карыстаецца як срэбным, але не менш вялікі і той, хто срэбным карыстаецца як гліняным.

Што ж будзе... з нашай маральнасцю, калі супраць яе паўстане цэлы народ? Абавязкова та або пачнеш прыпадабняцца яму, або яго ўзненавідзіш. Між тым і таго, і другога трэба пазбягаць: нельга прыпадабняцца злым дзеля таго, што іх многа, нельга ненавідзець многіх дзеля таго, што ім не прыпадабняешся.

Жыві так, быццам заўтра пераедзеш!

Грошы нікога не зрабілі багатым — наадварот, кожнага яны робяць яшчэ пажаднейшым да грошай.

Асалоду прырода прымяшала да рэчаў неабходных, не дзеля таго, каб мы яго дамагаліся, а каб дзякуючы гэтаму дамешку зрабілася прыемней для нас тое, без чаго мы не можам жыць. А з'явіцца самадастатковая асалода — і пачынаецца вычварэнства.

Як пышнасць баляў і адзежы ёсць адзнака хваробы, ахапіўшай дзяржаву, так і вольнасць мовы, калі сустракаецца часта, сведчыць пра падзенне душаў, з якіх сыходзяць гэтыя словы.

Ёсць два віды асалоды. Цялесныя асалоды хворасць абмяжоўвае, але не адымае і нават, калі правільна разважыць, робіць вастрэй. А ў задавальненнях душэўных, якія і больш, і надзейней, ні адзін лекар хвораму не адмовіць.

Каханне не жыве з боязю.

Будзьма ў «сямейным» гуморы

- Каханне — гэта прастора і час, прызначаныя дзеля сэрца. Бо хоць толькі шчасце з'яўляецца гаючым для цела, смутак і жальба развіваюць сілу духу.
- Добрая кухня — гэта, калі стравы маюць смак таго, з чаго іх прыгатавалі.
- Калі б нарачоныя ведалі пра сваіх абранніц тое, што ведаюць пра нявест іх мацяркі, свет быў бы поўны халасцякоў.
- Мужчына, які добра спраўляецца на кухні, — цудоўны прыяцель, чуллівы каханак, а часам і зносны муж.
- У маёй мамы то работа ў руках гарэла, переважна катлеты.
- Не кажы нікому, што дзеецца дома.
- Калі ўбачыш моль, што вылятае з шафы, крычы: «Лавіце злодзея!»

❑❑❑

Жонка прачнулася ноччу і кажа мужу:
— Антоська, я не магу заснуць.
— Як гэта не можаш?
— Я вось думаю, можа ты мне хоць новае паліто купіш.
— Куплю, спі.
— І новы капялюш да паліто...
— Куплю...
— Які ты добры, мой Антоська...
— Надта не цешся...
— А чаму?
— Я гутару з табой праз сон...

ВУЧЫМСЯ

Практычная стылістыка

Ці ж нам Статут не ўзор?

(Працяг.)

Асаблівасці ліста Тахтамыша, хана Залатой Арды, польскаму каралю Ягайлу, напісанага на беларускай мове ў 1392 ці ў 1393 годзе, сведчаць пра не тагачасны стан. Наша мова ў XIV стагоддзі не толькі спраўна выконвала функцыі дзяржаўнай мовы, але і выкарыстоўвалася кіраўнікамі іншых краін дзеля дыпламатычнай перапіскі.

Дасканалы стыль твораў эпісталярнага жанру XIV стагоддзя, амаль не мяняецца ў наступным стагоддзі. Пачытайце лісты аршанскага старасты Філона Кміты-Чарнабыльскага (1530—1587). Як вы мяркуеце, якое з пададзеных словаў і словазлучэнняў напісана «У Оршы», а якое «оу Ардзе на аустьи Дону»: *даючы ведаці, дал ведаць, ведаці магли і ведомо даем, вам даці веданіе, то поведаці; відзел есьмі, мовіл есьмі, есьмо былі* і *послалі есце, послалі есмо, есмо сел; непрыяцелю* і *непрыяцелі; послы его* і *послы сылалі?*

Пэўна, стылёва лісты ўсё ж розныя. Перш, ужо хаця б тым, што Тахтамыш пісаў роўнаму сабе — брату, як ён называў Ягайлу. А Кміта-Чарнабыльскі звяртаўся да свайго «начальства» — «панов рад Великого Княжества Літовского».

А да таго ж, як падае А.Ф.Коршунаў, лісты Кміты-Чарнабыльскага вылучаюцца вобразнай апавядальнасцю, апісаннем рэальнага побыту і жывым народным прастамоўем — «выходзілі за рамкі дакументальна-дзелавой пісьменнасці і набліжаліся да літаратурнай творчасці. Напісаныя ў эпічным стылі, яны падаюць сродкамі фальклорнай стылістыкі яркія бытавыя замалёўкі, раскрываюць і паказваюць характар чалавека, яго асабістыя перажыванні і адносіны да навакольнай рэчаіснасці... І ў гэтым заключаецца іх літаратурная вартасць. А гэта служыць пераканальным сведчаннем таго, як дзякуючы ўзрастаючаму мастацкаму майстэрству дзелавая пісьменнасць набывала спецыфічныя рысы славянскага «мастацтва»...

Як бачыце, эпісталярны (лістоўны) стыль нашай мовы развіваўся і ў XVI стагоддзі (лісты Кміты-Чарнабыльскага датаваны пераважна 1574 годам) дасягнуў надзвычай высокага ўзроўню. А гэта адбывалася толькі таму, што аўтары лістоў пісалі на жывой народнай мове тае пары.

Пётра ПАШКАВЕЦ.

(Працяг будзе.)

Клуб абітурыентаў

Дыктоўка

Максім Багдановіч

Бадай нікому з беларускіх паэтаў не выпаў такі незайздросны лёс, як Максіму Багдановічу. З маленства ён хварэе на сухоты. Не паспеўшы ўволю нацешыцца шчаслівым дзяцінствам, страчвае маці, а ўслед за ёй — і мілыя родныя мясціны, па якіх гадамі будзе сумаваць далёка на Волзе. І не толькі сумаваць, але і сэрцам ірвацца да свайго краю, да мілагучнай матчынай мовы, без якой яму не мысліцца далейшае жыццё.

Не лепшым чынам здзейсняцца і яго мары. Ён, хто ўсёй душой імкнуўся стаць літаратарам або вучоным, змушаны будзе вучыцца на юрыста, каб потым ні дня не працаваць па гэтай спецыяльнасці. Ніколі не загоіцца і яго боль па радзіме. Ён, хто лічыў, што толькі Беларусь і здолее вылечыць яго, памірае на чужыне. Нават смерць і тая не дала яму вечнага прытулку ў роднай зямлі. Крыўдай сціскаецца сэрца, калі згадваеш пра ўсе гэтыя нягоды. І можа трагічнасць лёсу і выклікае да яго асобы пабольшаную цікавасць. Бо і сапраўды — такое мала каму даставалася. Адзін з крытыкаў назваў яго творчае жыццё загадкай. Так, так, загадкай... І ў гэтым няма нічога дзіўнага.

Падрыхтаваў Іван КАЗЛОЎСКІ.

Юрась ПАЦЮПА

Культура мовы

Ці трэба беларусам пазычаць пасію?

«...Ці ёсць у нашай мове хоць якія адпаведнікі велікарускаму слову «страсти»?» — пытаецца ў № 12 «Нашага слова» У.Содаль і прапануе ў адказ: «**жарсці** (і, хіба яшчэ, **пламені**). Тутсама прыводзіць аўтар і цытату з канкрэтным ужываннем гэтага слова ды выпіску з слоўніка В.Ластоўскага, адкуль і пайшлі ў свет тыя **жарсці**.

Сама перш, дзякуй У.Содалю за пастаноўку пытання. Аднак... дазволю сабе даўняць, што аўтар не надта крытычна прачытаў Ластоўскага. Зрэшты, не ён адзін так. Нават Я.Станкевіч перапісаў **жарсць — страсть** і, апрача новых прыкладаў, нічога не дадаў. Паспрабую выказаць свае сякія-такія развагі, якія з'явіліся пасля таго, як я ўпершыню спаткнуў, здаецца ў «Свабодзе», гэнае слова. Яно мне адразу не спадабалася, падалося чыста польскім. Не сакрэт, што награвашчанне зычных, якое тут проста выпрамляе, ды яшчэ ў кароткім слове, для нашае мовы неўласцівае. Побач нават **страсць** падаецца нечым лягчэйшым, хаця старaславянізмы для нас менш кампліментарныя, чым паланізмы. Прынамсі, мая беларуская моўнасць не хацела з'яўляцца ў такім абліччы.

Нельга не пагадзіцца з У.Содалем, што ў пошуках слова трэба ісці не да перакладу, а «ад жывой мовы», бо «яна мае свае рэсурсы, іх трэба толькі адкрыць, вылушчыць, а навет і стварыць з пэўных беларускіх моўных каранёў...» Слова ўзнікае не як готовае схаластычнае значэнне і не як пусты футурыстычны гук, «просты, як рыканне» (хаця і рыканне не такое простае). Новае слова ўзнікае як пільная патрэба, імператыў новага сэнсу. Гэты сэнс звязаны з папярэдняю матэрыяй мовы. А ўжо пазней мы акрэсліваем канцэпты гэтага слова, называючы іх лінгвістычным значэннем. Нездарма не бывае ніколі двух аднолькавых тлумачальных слоўнікаў, але ў іх заўсёды ёсць няўлоўная агульнасць. І толькі трэцім этапам акрэслівання слова выступае яго прытарноўванне да чужаземнае лексемы. Калі ж гэтыя этапы пераварочваюцца з ног на галаву — тады мы маем справу з калькаваннем, штукаю, часамі карыснаю, але пабочнаю ў жыцці слова. На жаль, існуючы ў чужым кантэксце, мы — не-не — дый парушалі згаданы парадак. А якіх слоўнікаў у нас найболей? Ведама, расійска-беларускіх. Гэтак беларуская мова супраць жадання не моўнікаў і творцаў станавілася часцяком скалькаванаю з расійскай.

Чаму **жарсць**? Навошта такая эканомія? Ластоўскі ж прапаноўвае розныя варыянты, крыху даўжэйшыя, але значна мілагучнейшыя, прыкладам, **жарлівасць (жарлівая малітва**, а не **жарсная малітва**).

Мне здаецца, што ўсе гэтак ухапіліся за тое слова, мала думаючы пра яго вонкавасць, бо **жарсць** структурна тоесная **страсти**, амаль калька, а таму звыклая для слыху. Накінт польскасці я мала памыліўся, слоўнікі падаюць: **żarliwość — рвение, усердие, пыл, żarliwy — страстный, пылкий**; але **страсть — namętność, pasja, nałóg**. Калі ж пашукаць у польскіх дыялектах, дык можа і сама **жарсць** знойдзецца, зрэшты, гэтае слова выглядае нейкім польска-расійскім гібрыдам. **Пламені** таксама лёгка растлумачыць: **страстный** па-польску будзе **namętny**, у адным значэнні, а ў другім — **płomienny, gorоncy**, па-беларуску ж — **полымя**, а не **пламя**, і — **палымяны**. Значыць, нашыя журналісты, што тарнуюць **страсць**, не такія ўжо і благія супраць Ф.Багушэвіча, які ўжыў **пламені**, проста адным бліжэй расійская мова, другому — польская, а беларуская так і застаецца пад пытаннем.

І тут я хацеў бы закрануць крыху іншую, але блізкую тэму. У слоўніку XVII ст. «Сінонімы славеноросскай» таксама ёсць слова **жарлівасць** (не **жарсць**!), адпавядае яно расійскаму **ревность**. С.Станкевіч у працы «Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР» некалі пісаў, што пабеларуску **ревность** будзе **зайздрасць**, гэтак будзе і па-польску (**zajzdrość**). Хаця А.І.Прэабражэнскі, тлумачачы стараславянскі корань **ревн-** таксама адзначае: «**ревность**, рус. **зависть, недоверие** (в супружестве, любви)». Ды бадай нельга не пагадзіцца, што **ревность** і **зависть** — рэчы крыху розныя. Па-беларуску, аднак, першае не гучыць, як і **страсць**; **раўнаваць**, гэта што, аднакаранёвае **раўнасці** ці **роўнасці**? Дык можа Ластоўскі памыліўся і **ревность** растлумачыў як **страсць**, ёсць жа ў іх агульнае значэнне «захапленне, запал» («рвение, пыл»), ці тады гэтае слова было сінкрэтычнае? З прыведзеных у яго і ў Я.Станкевіча прыкладаў-цытат нельга вывесці нешта адназначнае. «Сінонімы славеноросскан» да слова **ревность** прапаноўвае яшчэ адзін адпаведнік — **гарлівасць**. І сама цікавае тое, што абодва словы з гэтым жа значэннем (**zarliwość, gorliwość**) ёсць у мове чэшскай, толькі першае звязана з каханнем, а другое — з работаю. Падобна і ў польскай мове: **gorliwość — стараннасць, шчырасць**. Абодва словы досыць зьвыклыя ў заходнеславянскім абсягу. Ды не буду пакуль спяшацца, пакіну гэта пытаннем для чытачоў «Нашага слова».

Вернемся да **страсці**. Старажытныя беларускія лексіконы не перакладаюць **похаць злая, вада, утрапенне, распусная роскаш, цярпенне, узрушэнне, афект, бяда, упадак, мука**. Найбольш цікавае з іх (і сёння вартае) **вада**; паводле Я.Станкевіча **вад** «спёка (зной)», **вадна** — «нясцерпна, стамлянна ад гарачыні», **вадзіць** — «вабіць, прыцягваць». Чамусьці У.Содаль, пішучы свой артыкул, не спасляўся на сучасны акадэмічны «Русско-белорусский словарь», а там ёсць паміж іншага ў значэнні «страсть» **захапленне, цяга, заўзятасць, запал, пакута, мука**, у значэнні «страстность» — **заўзятасць** і **палкасць**. Не так і мала варыянтаў супраць польскае мовы, прынамсі, ніякіх паланізмаў можна было б недадаваць. Але пашукаць сваё ніколі не зашкодзіць.

Расійскае слова **страсть**, як ведама, утворанае ад **страдать** і прыйшло яно з мовы стараславянскае. У еўрапейскай традыцыі якузоравае ёсць з гэтым значэннем лацінскае **passio** «страдание, страсть», што тарнуецца мовамі раманскімі ды англьскай, сустракаецца яно як пабочнае таксама ў іншых народаў. Нямецкі ж аналаг **Leidenschaft** таксама паходзіць ад **leiden** «пакутаваць, хварэць, цярпець, зносіць». Праўда, побач з **leidenschaftlich** «страстный» ёсць **feurig** «палкі, жарлівы», але апошняе не ахапляе ўсіх значэнняў **passio**.

У беларускай мове ўсім адценням лацінскага ўзору адпавядае, наколькі мне ведама, толькі адно слова: **рымасць**. Па ўсёй тэрыторыі Беларусі раскідана вельмі шмат аднакаранёвых яму слоў з рознымі, але ў той ці іншай ступені блізкімі значэннямі. Я.Станкевіч у сваім «Беларуска-расійскім (Вялікалітоўска-расійскім) слоўніку» дае іх цэлы шэраг, узяты пераважна з І.Насовіча і М.Гарэцкага: **рымсціць** «выжидать, терпеть, выдерживать несмотря на противоположное чувство» (паводле Насовіча), «выжидать, выдерживать (во времени)» (паводле Гарэцкага), **абрымсціць** «потерпеть, терпеливо выждать некоторое время»; **зрымсціць** «повременить, потерпеть»; **урымсціць** «выдержать причиняемую боль, тяжесть, испытание и т.п.; вытерпеть»; **рымсце** «хочется (позывает, подмывает)», **зарымсцела; урымсціцца** «удержаться»; ёсць тут і запісаные самім Станкевічам на Ашмяншчыне **рымець** «выходить из терпения». «Слоўнік Гродзенскай вобласці» Т.Сцяшковіч падае **рымсціць** «карцець», дыялектны зборнік «Живое народное слово» (Мн., 19[illegible]) — **рымсціць** «карцець» з гаворак Карэліцкага і Мазырскага раёнаў. І, нарэшце, зборнік «З народнага слоўніка» (Мн., 1975) на матэрыяле Стаўбцоўшчыны з'яўляе **рымець** «капрызіць, нервавацца, злавацца» і **рымасць** «нервознасць, злосць».

Удумаемся ў фразу, якая ілюструе апошняе слова: «Вот нека рымасць напала на яе, плакаць хочацца, сварыцца з кім-небудзь». Улічваючы ўсе вышэй пададзеныя значэнні, гэта можна перакласці і так: «Вот какая-то страсть напала на неё, плакать хочется...» Нам важней не тое значэнне, якое надаў аўтар, а тое, якое вынікае з усяго нацыянальнага маўлення. Праўда, не ведаю чаму, у мяне ў сведамасці ўвесь час узнікае не **рымасць**, а **рымста**, магчыма, паводле аналогіі з словамі **помста, змуста**. Такім чынам, **рымасць — страсть, рымсны — страстный, рымснасць — страстность**.

Рымсціць паводле М.Фасмэра (спасылка на Карскага) паходзіць ад літоўскага **rimti** «быць спакойным» (параўнайма: **пасія** «страсть» і **пасіўны** «спокойный»). Яно ў беларускай мове пры наяўнасці сваіх слоў **цярпець, трываць** паступова набыло (ці ў стадыі набывання?) супрацьлеглае значэнне. Падобныя пераверціны для народнае семантыкі не навіна, дастаткова прыгадаць, як стараславянскае **благо** «добра» стала беларускім **блага** «кепска».

Гісторыя слова **рымасць** у галоўных рысах і, што вельмі важна, неняўмысна, паўтарае гісторыю лацінскага **passio** і стараславянскага **страсць**. У сваім значэнні гэтае слова чыста беларускае, ды і балцкія карані, як ведама, нам не чужыя, як ангельскам раманскія. Мала таго, што яно спатыкаецца на ўсім беларускім абсягу, але **рымасць**, да таго ж, слова агульнаразумелае, хто ж не ведае прыметніка **няўрымслівы**!

Не думаю, што сам В.Ластоўскі настойваў на варыянце **жарсць** (ці лепей **жарасць**?), проста ў яго на тую пару не было лепшага слова. На жаль, Властаў слоўнік чытаюць не надта ўважліва, а там, дарэчы, ёсць і дадатак, дзе прапаноўваецца яшчэ адзін варыянт **страсти — яглаць**. Нельга думаць, што ў дадатку словы другасныя, хутчэй наадварот, Ластоўскі знайшоў іх у апошні момант і, як вельмі важныя, можа якія важнейшыя, чым у самім слоўніку, пастараўся зацеміць. **Яглась** таксама, на думку Фасмэра, мае балцкае паходжанне (ад слоў **сіла, здольнасць**). Я не буду яго падрабязна разглядаць, заўважу толькі, што і гэнае слова можна плённа выкарыстоўваць. Няхай кожнае нясе сваё адценне: **рымасць (рымста)** — гэта найбольш агульны панятак, які абазначае не толькі пачуццё, але і пакуту, лац. **passio**, ням. **Leidenschaft**, рас. **страсть**; **палкі, жарлівы** — звязана з каханнем, чалавечым характарам, ням. **feurig**, польск. **płomienny**, рас. **пылкий, пламенный; яглась** — выражае захопленасць, нястрымнасць, польск. **zamiłowanie, namętność**, або нават **nałóg**, рас. **увлечение, пристрастие** і г.д. Спіс можна было б доўжыць, але і так відаць, што беларусам ніколі не бракавала пасіі. І пазычаць яе не трэба, але трэба знайсці.

ACADEMIA «NS»

Мікалай КРЫЎКО — беларушчына.
Алена ШЧУКА — англійшчына.

СЛОЎНІК СІНОНІМАЎ

ПЕРАПРА́ВІЦЬ (перавезці, даставіць куды-н. цераз што-н.: якую-н. перашкоду, цяжкапраходнае месца і пад.) *Жарабят неадкладна перапраравілі на азёрны востраў, каб зберагчы ад ваўкоў, што, асмялеўшы, зграямі блукалі па наваколлі* (Хадкевіч). **ПЕРАКІ́НУЦЬ** разм. *[Васіль:] — Ён [Мікола] пачаў расказваць мне пра іхні партызанскі бой, пра самалёт, які перакінуў яго пасля ранення цераз фронт, пра іх шпіталь* (Брыль). **ПЕРАБА́ВІЦЬ** разм. — *Віктар застаўся там, у бараку, — адказаў, падумаўшы, Тарасюк. — Добра было б і яго сюды перабавіць. Тады ўсе былі б у зборы* (С.Аляксандровіч). — *Незакончанае трыванне:* **Перапраўляць, перакідаць** і **перакідваць, перабаўляць.**

ПЕРАПРАЦАВА́ЦЦА разм. (папрацаваўшы надта многа, выклікаць у сябе недамаганне) — *Пакорлівая дзеўка, бяздзівая. — У самы раз будзе вам. Нікуды не пойдзе жаліцца, што перапрацавалася. Не гарадская* (Галавач). **ПЕРАРАБІ́ЦЦА** разм. *Бліжэйшы быў бязвокі Ігнат: лена дзеўбаў ломам — гэты нідзе не перараболіцца, нідзе свайго не перадасць* (Гігевіч), **ПЕРАРАБІ́ЦЬ** разм. *Не надта і ты перарабіў на гаспадарцы.* — *Незак.:* **Перапрацоўвацца, перарабляцца** і **перарoбліваццa, перарабляць** і **перарoбліваць.**

Перапрацавацца. Англ. адпаведнікам для трох бел.дзеясловаў будзе адзін — **overwork**, які тым не менш цікавы для параўнання сваёй структурай: англ. прэфікс *over-* супадае семантычна з бел. *пера-*, а корань *-work* адпавядае бел. словам *праца, работа.*

ПЕРАПРАЦАВА́ЦЬ (змяніць, зрабіць больш дасканалым, падвергнуўшы дадатковай пераробцы, перапрацоўцы) *Не выпадкова, ствараючы новы варыянт твора [«Сымона музыкі»], Колас наймацней перапрацаваў апошнія раздзелы, дзе вызначаўся будучы лёс героя* (Каваленка), **ПЕРАРАБІ́ЦЬ** *Першы варыянт паэмы «Сымон музыка» быў закончан у 1918 годзе, а ў наступныя гады (1923—1925 гг.) аўтар перарабіў свой твор* (Навуменка). — *Незак.:* **Перапрацоўваць, перарабляць** і **перарoбліваць.**

Перапрацаваць. Усе тры англ. сінонімы: **amend, revise, modifi** былі запазычаны з іншых моў. *Amend* і *Revise* ўжываюцца, калі маецца на ўвазе перапрацоўка пісьмовых тэкстаў. **Modifi** мае больш шырокі сэнс (параўнайце бел. *мадыфікаваць).*

1. **ПЕРАПЫ́НАК** (часовае спыненне якога-н. дзеяння, працэсу, а таксама прамежак часу, на які спыняецца якое-н. дзеянне, працэс) *Творчая біяграфія паэта склалася так, што пасля першых пасляваенных вершаў пра адбудову радзімы,.. настае ў паэта вялікі перапынак* (Семашкевіч), **ПА́ЎЗА** (пераважна пра спыненне ў маўленні, размове, спевах і пад.) — *Назусім, — гэтак жа коратка сказала Зіна. І пасля кароткай паўзы дадала: — Мужа перавялі сюды працаваць* (Васілёнак), **ЗАМІ́НКА** (пераважна пра спыненне ў маўленні, размове) *Удаволі лёгкай, амаль дробязнай размове настала дакучлівая замінка* (Быкаў), **ПЕРАДЫ́ШКА** *Тыдні два яны [вучні] старанна паўтаралі пройдзенае за зіму, пісалі дыктоўкі, практыкаваліся ў граматычным разборы, рашалі задачы. Нарэшце настаўнік даў ім перадышку* (Колас), **ПЕРАДЫ́Х** разм. *Потым Цапка нешта нібы скаланула, ён загаварыў хутка, амаль без перадыху* (Сачанка). **ПЕРАДЫ́ХА** разм. *Гарманіст лупіў без перадыху, нешта зухавата падсвістваў* (Савіцкі). **ПЕРАСЦІХА́НАК** разм. *Дождж перш быў суняўся крыху, а потым зноў лінуў. Няма на яго перасціханку* (Калюга).

1. Перапынак. Англійскія адпаведнікі тут некалькі: **break, pause, respite, lull, breathing space**. Найбольш ужывальны з іх сінонім *break*, які часта падразумявае перапынак у якім-н. працэглым дзеянні або працэсе. Назоўнік *pause* часцей ужываецца для абазначэння перапынку ў размове. *Breathing space* найбліжэйшы да бел. *перадышка, перадых:* у ім скарыстаны аналагічны корань *breathe-* («*дыхаць*»).

Першы сінонім — *break* ужываецца і як адпаведнік. 2. **Перапынак** — «прамежак часу, на які спыняюцца заняткі» — у брытанскім варыянце англ. мовы, тады як у амерыканскім варыянце ўжываецца ўжо іншае слова — **recess**.

ACADEMIA «NS»

Гісторыя моваў на Беларусі

Уладзімір СВЯЖЫНСКІ,
кандыдат філалагічных навук

Беларуская мова

(Працяг.)

«належыць... стварыць асобны будынак, каб там даць магчымасць верным Хрысту жыхарам Прагі збірацца ў вызначаным месцы ў тым горадзе для слухання слова боскага на роднай чэшскай мове».

Ян Гус.

«Яшчэ святы Павел пісаў на мове тых, каму пісаў: яўрэям — па-яўрэйску, грэкам — па-грэцку. Таму мне не думаецца, што было б кепска пісаць чэхам кнігі па-чэшску, з дапамогай якіх яны маглі б мець хрысціянскую веру і добрыя павучэнні».

Тамаш Шчітны.

Без Яна Гуса не было б Скарынавай Бібліі

Перш чым перайсці да разгляду мовы першых рэлігійных тэкстаў на беларускай мове, трэба нагадаць, як пакутліва, з якімі драматычнымі калізіямі народы Еўропы дамагаліся чуць і чытаць слова божае на сваіх родных мовах.

Рымска-каталіцкая царква была буйным інтэрнацыянальным цэнтрам феадальнай сістэмы. Нягледзячы на ўсе ўнутраныя войны, яна аб'ядноўвала каталіцкія краіны ў адно вялікае палітычнае цэлае, якое знаходзілася ў супярэчнасці як з грэка-праваслаўным, так і з мусульманскім светам. Царква асвячала сваім аўтарытэтам непахіснасць існуючых феадальных парадкаў. Пад яе уплывам знаходзілася практычна ўся адукацыя, культурная палітыка і значная частка судовай практыкі, царкве належала ў Заходняй Еўропе ці не траціна ўсіх зямель, на якіх працавалі тысячы прыгонных і паўпрыгонных. На ўтрыманне святарства аддавалася дзесятая частка ўсіх даходаў недухоўнага прасталюдзіна («царкоўная дзесяціна»). Царкоўна-феадальная эксплуатацыя забяспечвалася «свецкім мячом», г.зн. ваеннай і паліцэйскай сілай свецкай дзяржавы.

Каталіцкая царква праводзіла прынцыповае адрозненне паміж «сакральнай» (свяшчэннай) дзейнасцю кліру і «недухоўнай» — парафіянаў. *Першая ацэньвалася як угодная Богу,* бо забяспечвала збавенне. Другая — як абыякавая да замагільнага лёсу, які залежаў выключна ад заслуг перад царквой (прыняцце таінстваў, удзел у абрадах, захаванне пастоў, наведванне *«святых месцаў»*, набыццё індульгенцый, добраахвотныя ахвяраванні і г.д.). Вызначальным, такім чынам, аказвалася падпарадкаванне царкоўным рэгламентацыям («святыя справы»), якія патрабавалі немалых грошай, якія, так бы мовіць, аўтаматычна набліжалі грэшнікаў да брамы раю. Як здабываліся гэтыя сродкі, наколькі шчырымі былі рэлігійныя пачуцці людзей — гэта царкву не цікавіла. Найбольш звыродлівае выражэнне такое ўяўленне атрымала ў практыцы продажу індульгенцыяў.

Усё гэта абумовіла ўзнікненне рознага роду ерасяў. Крытыка рымска-каталіцкай царквы займала цэнтральнае месца ў ерэтычна аформленым пратэсце. Нападкі на царкоўную іерархію, а таксама на ўстоі папскага панавання і каталіцкія дагматы і каноны жорстка караліся. У XIII ст. царква стварыла інстытут **інквізіцыі**, галоўная задача якога заключалася менавіта ў выкараненні ерэтычных вучэнняў. Да пачатку Новага часу колькасць ахвяраў яе дасягнула 9—12 мільёнаў чалавек. Гэта не азначала, што ерасі ўдалося падавіць. У XIV—XV ст. ерасі становяцца з'явай паўсюднай, дыферэнцыруюцца, напаўняюцца ўсё больш глыбокім сацыяльным і маральна-філасофскім зместам. Заходняя Еўропа стаіць на парозе Рэфармацыі, калі будзе зломлена духоўная дыктатура папства і каля палавіны заходніх хрысціян адпадзе ад рымска-каталіцкай царквы.

У XIV ст. у Італіі аформіўся кірунак грамадскай думкі, які атрымаў назву **гуманізму**. У цэнтры вучэння гуманістаў (Парэнца Вала, Піка дэла Мірандала і інш.) — праблема чалавека (гуманістычная культура — антрапацэнтрычная ў процівагу тэацэнтрызму сярэднявечнай схаластыкі), праблема зямнога прызначэння чалавека, яго выхавання і ўдасканалення, усебаковага развіцця здольнасцей і служэння грамадскім ідэалам, яркая рыса гуманістычнай ідэалогіі — культ ведаў, узвышэнне асветнага розуму над сляпой верай. Гуманізм унёс значны ўклад у працэс самавызначэння еўрапейскіх нацый. Гуманісты накіроўвалі сваю дзейнасць на засваенне ўсяго багацця антычнай культуры (крыніца антрапацэнтрызму — вучэнне Платона і Арыстоцеля). Гэта і ідэя паганізацыі хрысціянства, вяртанне да яго вытокаў, збліжэнне Ісуса з героямі антычнымі (з самаахвярнымі спартанцамі, якія аддалі свае жыцці пад Фермапіламі), *гэта і лозунг ad fontes!* (да першакрыніц!), у адпаведнасці з якім Эразм Ратэрдамскі лічыў, што вышэйшая годнасць Новага запавету ў тым, што ён не толькі прадпісвае чалавеку дасканалейшыя маральныя патрабаванні, але і прадстаўляе ўзор іх выканання. Гэта — Ісус — чалавек, жывы прыклад для хрысціянскага пераймання. Хрысціянін павінен ведаць аб ім **усё** і **дакладна**, а для гэтага трэба вярнуцца да **першакрыніцы**, да **грэцкага** тэксту Евангелля, недасканала перакладзенага ў IV ст. Еранімам, праца якога кананізавана царквой. У 1516 г. Эразм выдае свой новы пераклад грэцкага евангелля на царкоўную, лацінскую мову, удзяліўшы галоўную ўвагу менавіта ўдакладненню маральных паняццяў і сімвалаў. Гуманісты-прадрэфарматары смела нападалі на абрадава-культавы бок сярэднявечнага каталіцызму, але былі яшчэ далёкімі ад таго, каб паставіць пад сумненне яго дагматы. Яны не замахваліся на ідэю непагрэшнасці існуючай царкоўнай арганізацыі, яе «звышпрыроднага», «боскага» паходжання. Г.зн. яны яшчэ не ставілі пытанне аб стварэнні нацыянальнай царквы, незалежнай ад Рыма, хаця і імкнуліся даць *парафіяніну* Біблію на зразумелай мове. Сын заможнага селяніна Ян Гус, прапаведнік Віфлеемскай царквы ў чэшскай Празе, выступіў з рэзкай крытыкай каталіцкага Рыма. Калі ў 1410 г. яго *адлучылі ад царквы*, ён працягваў чытаць свае пропаведзі, ігнаруючы рашэнні царкоўнага кіраўніка. Але ён ніколі не рызыкнуў бы адлучыць самога Папу ад праўдзівага хрысціянства. І не таму, што быў баязлівы (у смеласці Гус якраз пераўзыходзіў любога з рэфарматараў XVI ст.). Падобная акцыя проста не магла быць са спачуваннем прынята ні заходнееўрапейскімі, ні нават чэшскімі недухоўнымі. Па рашэнню Канстацкага *сабору Ян Гус* быў адпраўлены на касцёр. Ён быў фактычна першы, хто аддаў жыццё за родную мову. Да пачатку XVI ст., калі распачаў сваю дзейнасць наш зямляк Францыск Скарына, Гус і яго паплечнікі мелі ўжо каля 30 рукапісных і друкаваных перакладаў Бібліі на чэшскую мову. Адзін з іх, надрукаваны ў Вене ў 1506 г., і паслужыў узорам і дапаможнікам пры падрыхтоўцы Скарынам свайго перакладу-рэдакцыі Свяшчэннага пісання.

(Працяг будзе.)



Ключ ад роднай хаты

II

Мусіць, неаднойчы самому сабе задаваў падобныя пытанні і пісьменнік-дакументаліст Вячаслаў Лапцік, збіраючы па драбніцах кнігу «Мой сум, Нарочча...» («Мастацкая літаратура», 1993 г.), сапраўды сумную «біяграфію» вайны той самай сістэмы супраць возера Нарач — адвечнай карміцелькі прынарацкага жыхара — рыбака і селяніна. І зноў жа свой, але да драбніцаў знаёмы сюжэт. Адно што не на поўдні, а на поўначы Беларусі. Знішчэнне роднай мовы і культуры... Знішчэнне насельнікаў роднай вёскі Сіманы... І не толькі — ад войнаў і «хапуноў», а яшчэ ад знясільвальнай, не падмацаванай тэхнікай і добрай спецвопраткай і абуткам працы на калгасным полі ды на «блакітным нарацкім «ворыве».

І зноў жа згадваюцца мне мае землякі з Чарняца, што не дажылі свайго веку, калі Вячаслаў Лапцік прыводзіць страшэнную статыстыку вымірання:

«...**У маёй вёсцы Сіманы сёння налічваецца 40, а дваццаць гадоў назад тут жыў 61 чалавек. Прычым пайшлі на той свет самыя працавітыя, цягучыя мужчыны: Мікалай Савук, памёр у 56 год, пражылі Іван Савук 68, Геня Савук 59, Аркадзь Мурза 51, Паўлік Кабайна 57, Міхаіл Лапцік 66, Аркадзь Лапцік 45 год... Занадта мала яны пражылі ў эпоху «поўнай і канчатковай перамогі сацыялізму ў СССР».**

Але ў выпадку з Нарачу генацыд дапаўняўся экацыдам, бо сістэма заўжды думала толькі пра дзень сягонняшні: яна шчодра атручвала вакол возера зямлю мінеральнымі ўгнаеннямі, яна будавала непадалёк ад жамчужыны Беларусі жывёлагадоўчыя комплексы, лецішчы для камуністычнай эліты, яна не праводзіла тут біялагічнай ачысткі... А возера зрабіць бы запаведным, зберагчы для нашчадкаў.

Вячаслаў Лапцік знаёміць нас з меркаваннем вучонага У.П.Ляхновіча:

«Калі не навесці парадак на Нарачы, то да 2000 года возера будзе мёртвым, як Мінскае мора. Яно захаваецца, — удакладняе вучоны, — але вада стане якраз такой, як сёння ў Мінскім моры».

І поўніцца душа адчаем: да якой жа мяжы самазнішчэння мы дайшлі, калі да біялагічнай смерці возера Нарач — гэтай нязменнай своеасаблівай візітоўкі нашай гісторыі, усёй нашай сённяшняй і ўчарашняй дзяржавы — засталася адна пяцігодка!..

III

Наша самазнішчэнне шматаблічнае.

Давайце спачатку зірнём на тое, што ляжыць, як той казаў, на паверхні. Хаця б — нашу агульную з сучаснымі летувісамі старажытную гісторыю. Так, сапраўды, мы некалі жылі ў адной магутнай дзяржаве — Вялікім Княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім. Але сёння афіцыйная гісторыяграфія Летувіскай Рэспублікі заяўляе на сваю, так бы мовіць, першаснасць у гісторыі ВКЛ: маўляў, і стваральнікі Княства былі іхнія продкі — князі «Міндоўгас», «Вітаўтас» і да т.п.

Чаму так адбываецца?

Бо мы не шануем свайго, не аберагаем, найперш, родныя куткі ад гістарычнага бяспамяцтва. У сваёй жа суме расківанае па краіне і па нашай грамадзе манкурцтва і дае падставу для шавіністаў ды нацыянальных нігілістаў крычаць на ўсіх перакрыжаваннях, што наша гісторыя — гэта гісторыя Расіі, а затым — СССР.

Сумна. Але адчайвацца не трэба.

Бо ёсць людзі, якія кладуць і жыццё, і здароўе, каб прасвятліць наш народ ведамі пра іхнія селішчы, іхнія краі ды ўскрайкі.

Палачанін Уладзімір Арлоў. Я толькі пералічваю загалоўкі яго кніжак, каб чытач зразумеў, што тэма гісторыі яго роднай Полаччыны і Полацка — гэта галоўная тэма ягонай творчасці: «Дзень, калі ўпала страла», «Міласць князя Гераніма», «Мой радавод да пятага калена», «Таямніцы полацкай гісторыі».

Івацэвічанец Яраслаў Пархута. Гэта ён з няхітрай кайстрай, дыктафонам і блакнотам пешкі абышоў спачатку ці не ўсю Заходнюю Беларусь, а потым і Беларусь Усходнюю, адкуль прынёс свае кнігі, прысвечаныя менавіта гэтым куточкам нашай роднай зямлі, пра якія, можа, раней не ведалі беларусы: «Там, дзе жыве Юлька», «Пад высокім сонцам», «Жаваранак над лесам», «Зямля бацькоў нашых», «Дарогамі надзеі і трывог», «Жальба жытняга коласа». Хутка з'явіцца ягоная дакументальная аповесць пра беларускія вёскі з назвай Крывічы...

Гэта ён, Яраслаў, першы пераканаў мяне, што Тадэвуш Касцюшка напачатку быў героем беларускага народа, быў беларусам, а затым ужо належаў Польшчы, Злучаным Штатам Амерыкі і іншым краінам.

Гэта ён, Яраслаў Пархута, услед за Язэпам Семяжонам нагадаў жыхарам вёскі Пятровічы, што на Меншчыне: трэба было б назваць мясцовую школу імем іхняга славутага земляка, ганаровага члена АН СССР, вядомага этнографа, лінгвіста і географа Эдуарда Пякарскага, бо некаторыя польскія літаратары заднім чыслом імкнуцца залічыць яго ў лік «сваіх», зрабіць яшчэ адной зоркай першай велічыні сваёй нацыянальнай культуры і навукі. Яны так і паведамляюць прэсе, маючы на ўвазе, што Эдуард Пякарскі быў па веравызнанні католікам...

Гэта ён, Яраслаў Пархута, рашуча выступіў за захаванне спрадвечна беларускіх назваў нашых сёл і вёсак, супраць перайначання тых назваў на расійска-саўковы кшталт...

* * *

Але пакуль ва ўсёй нашай краіне становішча, якое нечым нагадвае становішча з беларушчынай у Пятровіцкай школе, якая, па словах Я.Пархуты, беларускамоўная, але не мае беларускіх падручнікаў, не мае навінак беларускіх выданняў.

А тым часам у Якуцку даўно стаіць адліты ў бронзе помнік Эдуарду Пякарскаму, а ў амерыканскім горадзе Касцюшка іменем нашага земляка яшчэ і названа мясцовая школа, ды таксама высіцца помнік беларускаму герою, за дастойнае шанаванне якога ў нас змагаецца пакуль толькі культурная камісія ўправы БНФ «Адраджэньне».

«Няўжо такое знарок робіцца?» — пытаецца ў кнізе «Жальба жытняга коласа» Яраслаў Пархута.

Знарок, шаноўны Яраславе, знарок...

Алесь МІКАЛАЙЧАНКА.

Ствараем энцыклапедыю «Новай зямлі»

Валянціна ВЫХОТА

Коласавы зярняткі

(Працяг.)

І дзядзька стоража пытае:
— А колькі той білет каштуе?..

Каштаваць. Ням. *kosten* узыходзіць ад лацінскага *constare* 'абысціся, каштаваць', якое дало вульг.-лац. *costāre*, ст.-франц. *co(u)ster*. Адсюль каля 1200 года было запазычана ў с.-в.-ням. *kosten.*

Kosten <лац.> каштаваць (мець цану)

Амброжык Кубел разгуляўся,
Са ўсімі шчыра цалаваўся,
І кварту трэцюю ўжо ставіў,
І ўсёю выпіўкаю правіў.

Кварта. Ням. *Quart n,* с.-в.-ням. *quart(e) n, f* 'Чацвёртая частка чаго-небудзь' ад лац. *guartus* 'чацвёрты'.

Quart,das <лац.> кварта.

Ну, што ж? — пытае дзядзька Грышку: —
Хіба дзе выпіць па кілішку
Ды падкрапіцца б мала-мала?

Келіх. Ням. *Kelch m,* с.-в.-ням. *kelch,* ст.-в.-ням. *kelich (hh),* запазычана з лац. *calix* з тым самым значэннем.

Kelch, der <лац.> келіх.

— Сюды, сюды кіруйся, браце:
І месца будзе й корму хваце.

Кіраваць. Кіравацца. Ням. *kehren* 'паварочваць', с.-в.-ням. ст.-в.-ням. *kēren.* Ст.-в.-ням. *kēran chērren* 'паварочваць, даваць ці браць кірунак'. 1.-е. корань **ger-* 'круціць, гнуць'.

А людзі дзядзьку шанавалі,
І на кірмашы частавалі.

Кірмаш. Ням. *Kirmes f,* с.-в.-ням. *kirmësse* 'асвячэнне храма'. У с.-ням. *Kirchmesse* ужываліся палягчальныя *Kirmesse, Kirmes, Kirmse, Kirms.*


Ням. *Kirchmesse f* складанае слова *Kirche f* 'царква', с.-в.-ням. *kirche,* ст.-в.-ням. *ki[illegible]hha [illegible]irihha* ад гр. *kyriake* (грэч. *kyrios* 'гасподзь') *oikia* (грэч. 'дом') 'дом госпада Бога'. Ст.-слав. *crŭky,* рус. *cerkov.*

Kirche, die <грэч.> царква.

Імша. Ням. *Messe f,* с.-в.-ням. *misse, mësse,* ст.-в.-ням. *missa, mëssa* 'богаслужэнне, царкоўны фэст', 'кірмаш'. Запазычана з лац. *missa,* першапачаткова, *ite, missa est (concio)* 'Ідзіце, збор скончаны'. Спачатку царкоўны фэст, потым кірмаш, які адбываўся ў святочныя дні, потым наогул кірмаш: *die Leipziger Messe* 'Лейпцыгскі кірмаш'.

Messe, die <лац.> імша.

(Працяг будзе.)













Аўтар гэтага гістарычнага комікса, пачатак якога надрукаваны ў № 23—24, — Дзмітры Палікарпаў (у тым нумары ягонае прозвішча не было пададзена — перапрошваем). Сёлета ён закончыў Акадэмію мастацтваў Беларусі, на «выдатна» абараніў дыплом. Віншуем Дзмітра і зычым яму творчых поспехаў.

У фонд газеты «Наша слова» ахвяравалі:
Раіса Жук-Грышкевіч (Канада) — 20 долараў ЗША
Валянціна Выхота (г. Менск) — 28 500 рублёў.
Шчыра дзякуем!

Шаноўныя чытачы!

Колькасць падпісчыкаў на газету «Наша слова» знізілася. Мяркуем, такое здарылася з прычыны часовага прыпынення выдання газеты. Але, верагодна, некаторыя з нашых сталых чытачоў не падпісаліся таму, што калектыў рэдакцыі не здолеў спатоліць іх пэўных патрабаванняў да зместу газеты. Чакаем вашых прапаноў.

Нагадваем, што падпіска на «Наша слова» працягваецца.

Наш індэкс — 63865.

Падпісная цана:
на 1 месяц: 2500 рублёў у Менску,
2000 рублёў па краіне.

І СМЕХ І ГРЭХ

Пачутае «У Лявона»

* * *

— Такая прыгожая маладзіца, відаць, што закахалася ў цябе, а ты яе пазбягаеш...

— У яе да мяне слабасць, а я да яе не маю моцы.

* * *

— Што там у вас сёння на абед? Нясіце лепшае, бо я з Ганкай.

— Дзеля таго, хто з Ганкай, прапануем манку.

* * *

— Якое шчасце, што ты маеш вушы! — кажа стары наведвальнік шынка свайму знаёмаму, што прыйшоў у новай шапцы.

— Так, сапраўды, мае вушы — гэта маё шчасце, яны ніколі не перадаюць языку тое, што пачулі...

— Але, каб не твае вушы, то твая шапка паламала б табе плечы.

* * *

— І гэта яна табе такое зрабіла?! Во дык змяя.

— Каб жа змяя, яны ж, кажуць , мудрыя.

* * *

— Што ты робіш з грашыма! — абураецца муж сталай наведвальніцы шынка.

— Я і сама пра гэта не раз думала.

* * *

— Пра некаторых жа наогул не пачуў бы аніводнага добрага слова, калі б самі пра сябе не гаварылі.

* * *

— Гляджу я на цябе і згадваю Дарвіна...

— А хто гэта такі?

— Гэта быў англійскі натураліст, славуты вучоны.

— І ты хацеў сказаць, што я на яго падобны?

— Не, але ён быў перакананы, што чалавек паходзіць ад малпы...

* * *

Увайшла бабуля ў вагон з поўным кошыкам, села і сядзіць. Аж вось і білеты правяраюць.

— Бабусю, — кажа кандуктар, — у вас ёсць білет?

— Ёсць, — кажа тая, паказваючы.

— Гэты не гадзіцца, — кажа кандуктар, гледзячы на білет.

— Як не гадзіцца?! — здзіўляецца бабуля. — Сем дзён гадзіўся, а цяпер не гадзіцца?!

Пароды

Георгій ЮРЧАНКА.

У сваім пакоі

я — гаспадар
у сваім пакоі.
....
Прысяду на родным парозе,
падумаю трохі.

Святаслаў Макаль.

Маю свой пакой на славу —
шафа, вешалка, замок,
новы стол ды стул кульгавы,
этажэрка, дыванок.
Цыгарэты і махорка —
ўсё сваё, не трэ «страляць».
У куточку цацак горка,
слаўна ранкам пагуляць.
Злева — зэдаль ля парога,
справа — ложак пры сцяне.
Ведай, прыме ён любога,
рассцялі яго ці не.
У бутэльцы — вязкі клейстар.
Кніг паліца. Але знай:
што ні аўтар — кожны бездар,
ці чытай, ці не чытай.
Іх гартаеш як няшчасце,
горка коўтаеш тугу...
Толькі кнігу «Дзверы насцеж»
я як вока берагу.

Афарызмы

Конь — самая прыгожая здабыча чалавека.

Французскі натураліст.

Калі б мусілі вывучаць усе законы, не хапала б часу на іх парушэнне.

Вольфганг Гётэ.

Ніводная сапраўдная праблема не можа быць развязаная, сама лепшае, што можна дзеля яе зрабіць, гэта забяспечыць яе існаванне.

Шарль дэ Голь.

Пытацца, хто мае быць шэфам, гэтак жа сама бязглузда, як пытацца, хто мусіць быць тэнарам у квартэце. Зразумела, што той, хто зможа спяваць тэнарам.

Генры Форд.

Не люблю працы — кожны чалавек яе не любіць. Люблю аднак жа тое, што дае праца: гэта шанц знайсці сябе, сваю існасць — дзеля сябе самога і дзеля іншых.

Джозэф Конрад.

Работнікі разумовай працы стараюцца, каб жывіцца з сваёй галавы. Жывіць іх яна ў наш час лепш, калі выдумаць тое, што зашкодзіць шмат каму.

Бертольд Брэхт.

Выпадковыя адкрыцці надараюцца толькі падрыхтаваным галовам.

Блез Паскаль.

Калі быць сабой, трэба быць асобай.

Станіслаў Ежы Лец.

Заснавальнік: ТБМ імя Ф.Скарыны.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220029, г.Менск, вул.Чычэрына, 1. Тэлефон: 33-17-83.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:
Эрнэст Ялугін — галоўны рэдактар, Лявон Баршчэўскі, Янка Брыль, Анатоль Бутэвіч, Вінцук Вячорка, Віктар Гайсёнак, Радзім Гарэцкі, Ніл Гілевіч, Аляксей Глушко, Сяргей Запрудскі, Анатоль Клышка, Уладзімір Ламека, Зміцер Санько, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун, Віктар Шніп.
Адказны сакратар Здзіслаў Сіцька.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара можа не адпавядаць меркаванню рэдакцыі. Рукапісаў рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

Індэкс 63865. Замова 2332

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220041, г.Менск, пр.Ф.Скарыны, 79.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Наклад 3970 паасобнікаў.
Падпісана ў друк 3.07.1995 г. у 15 гадзін.